Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 ЛЮТАГА 2017 г. АЎТОРАК № 30 (28394)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Апошні жыхар вёскі Немкавічы
СТАР. 6




Чаму цяжка вярнуць грошы за сумнеўны тавар
СТАР. 7



Беларускія кніжныя калекцыі... у Лондане
СТАР. 8

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый ВАРАНЕЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:**

*«Палітычны імідж краіны напрамую звязаны з інвестыцыйнай прывабнасцю. Калі ў дзяржавы вельмі добры імідж, ёсць аўтарытэт, то інвестар зверне позірк на гэтую краіну, потым будзе аналізаваць, якое тут заканадаўства, якія ёсць магчымасці. Беларусь — краіна з багатай гісторыяй, традыцыямі, велізарнымі магчымасцямі і патэнцыялам».*

# НОВАЯ ВЫШЫНЯ

## Дар'я Домрачава вярнулася на спартыўны Алімп




Фота БЕЛТА.

**Балельшчыкі, журналісты і трэнеры з трывогай чакалі пачатку сёлетняга чэмпіянату свету па біятлоне. Мы заўсёды спадзяёмся на добрае выступленне ўсёй беларускай зборнай, але перад стартам планетарнага першынства ў Хохфільцэне ў спартыўных колах лунала дадатковае пытанне: ці зможа прыма айчыннага біятлона вярнуцца на п'едэстал?**

Адказу ад Дар'і доўга чакаць не прыйшлося. У гонцы пераследу адставанне ад лідара — чэшкі Габрыэлы Коукалавай складала практычна паўтары хвіліны, аднак аказалася, гэта не перашкода для нашай Дашы. Бліскуча прайшоўшы ўсе агнявыя рубяжы, на дыстанцыі беларуска праявіла былую моц і ў літаральным сэнсе ўварвалася на п'едэстал. Прайграўшы пераможцы ўсяго 11,6 секунды, Дар'я заваявала сярэбраны медаль чэмпіянату і прадэманстравала самы ўражальны ўзлёт у пасьюце на чэмпіянатах свету за апошнія 17 гадоў.

**З высокім дасягненнем спартсменку павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.** *«Мы ўсе з нецярпеннем чакалі твайго вяртання на біятлонны Алімп, і ты апраўдала надзеі мільёнаў сваіх прыхільнікаў па ўсім свеце, прадэманстраваўшы яркае выступленне на трасе Хохфільцэна. Гэта вельмі важная перамога не толькі для цябе самой, але і для ўсяго беларускага спорту. Твае дасягненні — цудоўны прыклад спалучэння актыўнай жыццёвай пазіцыі з выдатнымі спартыўнымі вынікамі», — гаворыцца ў віншаванні.*

СТАР. 15

■ Лёсы

# Для шчасця неабавязкова мець рукі і ногі,

## або Як прага кахання зрабіла сапраўдны цуд



**34-гадовы аршанец Аляксей Талай, не зважаючы на адсутнасць ног і рук, шчаслівы чалавек. Ён — бацька траіх дзяцей. Больш за тое — паспяховы прадпрымальнік. Ён выступае з матывацыйнымі лекцыямі ў нашай краіне і за мяжой. Часта яго можна ўбачыць у папулярных тэлевізійных шоу. Выступленне Аляксея ў праграме Андрэя Малахава «Няхай гавораць» выклікала фурор: яго сустракалі стоячы і апладысментамі. Як і яго жонку, сваякоў, сяброў...**

### «Рэха вайны» змяніла жыццё

Яго нярэдка блытаюць з аўстралійцам Нікаласам Вуйчычам. Дарэчы, яны — равеснікі. Размовы, перапіска з Аляксеем не раз натхнялі іншых людзей. У яго нямала лістоў і электронных паведамленняў са словамі падзякі. У тым ліку і ад тых, хто хацеў скончыць жыццё самагубствам. Ён не ўтойвае, што часам і сам задумваўся, а ці варта жыць у такім становішчы. Такія думкі ўзнікалі пасля таго, як у 16 гадоў падарваўся на міне. Трагедыя адбылася ў вёсцы, дзе жыве яго дзядуля, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета дзядулі, у гонар якога назвалі Лёшу, споўніцца 90!

СТАР. 5

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8891 | ▼ |
| Еўра | 2,0111 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17030

## Размова аб надзённым

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з галоўным рэдактарам газеты «Народная воля» Іосіфам Сярэдзічам.**

Аб асабістай сустрэчы з кіраўніком дзяржавы рэдактар выдання прасіў 3 лютага падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». І цяперашняе мерапрыемства фактычна стала працягам сур'ёзнай размовы, распачатай крыху больш за тыдзень таму.

Аляксандр Лукашэнка выказаў гатоўнасць адказаць на ўсе актуальныя пытанні, адзначыўшы, што разлічвае на наступнае аб'ектыўнае асвятленне вынікаў размовы.

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася сітуацыя ў сферах палітыкі і эканомікі, у тым ліку праблемныя пытанні, якія маюць грамадскае гучанне, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Асаблівая ўвага была ўдзелена шляхам іх вырашэння.

## АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА АПТЫМІЗУЕЦЦА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 13 лютага падпісаў указ №40 «Аб аптымізацыі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Дакумент прыняты ў мэтах удасканалення дзейнасці Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, аптымізацыі яе структуры і колькасці. У адпаведнасці з патрабаваннямі кіраўніка дзяржавы па скарачэнні дзяржаўнага апарату колькасць дзяржаўных служачых Адміністрацыі Прэзідэнта скарачаецца на 30%.

Указам зацверджаны ў новай рэдакцыі Палажэнне аб Адміністрацыі Прэзідэнта і яе структура, а таксама палажэнні аб памочніку Прэзідэнта і прэс-сакратары.

Актуалізаваны функцыі і паўнамоцтвы Адміністрацыі Прэзідэнта. Новая структура дазволіць забяспечыць эфектыўнасць далейшай работы гэтага дзяржоргана ва ўмовах скарачэння колькасці яго работнікаў.

Рэфармуецца інстытут памочнікаў кіраўніка дзяржавы. Уводзяцца дзве новыя пасады памочнікаў Прэзідэнта.

Узаемадзеянне кіраўніка дзяржавы з заканадаўчай і судовай галінамі ўлады будзе забяспечвацца памочнікам Прэзідэнта па пытаннях заканадаўчай і судовай дзейнасці, а кантроль за выкананнем даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытаннях дзейнасці банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый — памочнікам Прэзідэнта па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы.

Новым Палажэннем аб прэс-сакратары Прэзідэнта Беларусі прадугледжваецца значнае пашырэнне функцый і паўнамоцтваў прэс-сакратара, у тым ліку па каардынацыі дзейнасці найважнейшых дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі.

Указ уступае ў сілу 1 мая 2017 года.

### Падрабязнасці

# УЗРОВЕНЬ ЗЛАЧЫННАСЦІ СТАНОВІЦЦА НІЖЭЙШЫМ, А РАСКРЫВАЛЬНАСЦЬ РАСЦЕ

## На пасяджэнні калегіі МУС падвялі вынікі мінулага года

**Сярэдні ўзровень злачыннасці па краіне склаў 979 здарэнняў на 100 тысяч насельніцтва, агульная колькасць злачынстваў у параўнанні з пазамінулым годам знізілася на 4,2%.**

У пасяджэнні калегіі прынялі ўдзел дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў Зась, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання. З дакладам перад прысутнымі выступіў міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч.

Згодна з агульнагадавой статыстыкай, зменшылася колькасць пацярпелых ад супрацьпраўных дзеянняў у грамадскіх месцах, а таксама тых, хто загінуў ці быў паранены ў выніку здзяйснення злачынстваў, менш стала і «вулічнага» беззаконня. На шчасце, удалося змяніць сітуацыю з пагрозлівым распаўсюджваннем наркаманіі, у тым ліку захаваць тэндэнцыю да зніжэння падлеткавай нарказлачыннасці.

А вось барацьба з «зялёным змеем» не губляе ні актуальнасці, ні інтэнсіўнасці: супрацоўнікі праваахоўных органаў не толькі процідзейнічаюць існаванню нелегальнага рынку алкаголю, але і праводзяць прафілактычную работу супраць злоўжывання спіртнымі напоямі. Ад гэтага фактару напрамую залежыць грамадскі парадак. Напрыклад, тры чвэрці ўсіх бытавых злачынстваў здзяйсняюцца ў стане алкагольнага ап'янення.

Пры гэтым фактаў выяўлення нецвярозых вадзіцеляў становіцца менш, а лік аўтааварый па іх віне знізіўся амаль на траціну. Сумная лічба, нягледзячы на зніжэнне агульнай колькасці аварый на дарогах, — колькасць загінулых дзяцей у выніку дарожна-транспартных здарэнняў (12 у 2015 годзе і 18 у 2016 годзе).

На калегіі таксама былі падведзены вынікі работы органаў унутраных спраў. Лепшымі прызнаны супрацоўнікі Расонскага, Бераставіцкага, Асіповіцкага і Лідскага РАУС. Ім быў уручаны пераходны ганаровы прыз. Узнагарода заснавана ў памяць аб байцах батальёна, якія праявілі гераізм пры абароне Магілёва ў 1941 годзе, а таксама ўсіх супрацоўніках органаў унутраных спраў Беларусі, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Акрамя таго, адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераходным прызам імя легендарнага сышчыка П.А. Каралёва «За адданасць службе крымінальнага вышуку і высокае майстэрства ў аператыўна-вышуковай дзейнасці». Уладальнікамі бронзавых бюстаў сталі аддзяленні крымінальнага вышуку Шаркаўшчынскага і Клімавіцкага РАУС, а таксама аддзелы Кобрынскага РАУС, УУС адміністрацыі Ленінскага раёна г. Магілёва, УУС Бабруйскага гарвыканкама.

Узнагароды атрымалі і пераможцы спартакіяды МУС па службова-прыкладным і масавым відах спорту. На першым месцы аказаліся спартсмены з Дэпартамента аховы, на другім — УУС Гродзенскага аблвыканкама і на трэцім — іх калегі з ГУУС Мінгарвыканкама.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Гурбангулы Бердымухамедава пераабралі прэзідэнтам Туркменіі

Кандыдат ад Дэмакратычнай партыі, дзеючы кіраўнік Туркменіі Гурбангулы Бердымухамедаў перамог на выбарах прэзідэнта краіны з 97,69% галасоў. Такія папярэднія даныя абвясціў Цэнтрвыбаркам рэспублікі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Гурбангулы Бердымухамедава з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Туркменістана, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. *«Пераканаўчая перамога — сведчанне прызнання вашага бясспрэчнага аўтарытэту як нацыянальнага лідара, падтрымкі ўзятага вамі курсу на ўмацаванне незалежнага Туркменістана і яго пазіцый на сусветнай арэне»,* — гаворыцца ў віншаванні.

### Мінулы год стаў самым бедным па колькасці адкрытых радовішчаў нафты і газу

Іх адкрылі ўсяго 174 супраць 400—500 штогод у папярэднія шэсць дзесяцігоддзяў, паведамляецца ў новай справаздачы амерыканскай кансалтынгавай кампаніі IHS Markit. Нафтагазавыя кампаніі скарацілі інвестыцыі ў разведку. Эксперты ацэньваюць сукупны аб'ём выяўленых летась запасаў у 8,2 млрд барэляў у нафтавым эквіваленце. Крызіс у нафтаразведцы можа прывесці да таго, што попыт на энерганосьбіты, які расце, у наступныя дзесяцігоддзі перш за ўсё будзе забяспечвацца за кошт амерыканскай сланцавай нафты.

### Дзевяць чалавек накрыла лавіна ў Французскіх Альпах

Лавіна сышла на гарналыжным курорце Цінь у французскім рэгіёне Рона-Альпы. Дзевяць лыжнікаў, уключаючы правадніка, апынуліся пад лавінай на вышыні 2,1 тыс. м. Спачатку паведамлялася аб двух загінулых, аднак былі знойдзены целы яшчэ двух чалавек. Пошукі астатніх пяці лыжнікаў працягваюцца. Паводле слоў ратавальнікаў, шанцы знайсці іх жывымі невысокія.

### Здымак забойства расійскага пасла ў Турцыі атрымаў галоўны прыз World Press Photo



Здымак, зроблены турэцкім фатографам Бурханам Азбіліджы падчас забойства расійскага пасла ў Турцыі Андрэя Карлава, атрымаў галоўны прыз World Press Photo. «Гэта было вельмі складанае рашэнне, — адзначыла член журы Мары Калверт. — Мы выбралі менавіта гэты здымак, паколькі ён не толькі з'яўляецца вельмі эмацыйным, але і сапраўды адлюстроўвае нянавісць нашага свету. Кожны раз, калі ты глядзіш на гэтую фатаграфію, так і хочацца адсунуцца ад яе далей».

### Вынікі тыдня



# Можна ўздыхнуць з палёгкай?

У ЗША пачалася **новая хваля выкрыццяў злоўжыванняў падчас прэзідэнцкіх выбараў**. Калі пасля перамогі Трампа ў ёй сумняваліся ў асноўным яго апаненты, якія не маглі паверыць у свой пройгрыш, то цяпер абмеркаванне гэтай тэмы ініцыяваў сам Белы дом. Як заявіў старшы дарадца Дональда Трампа па палітычных пытаннях Стывен Мілер у інтэрв'ю тэлеканалу ABC, існуе мноства доказаў фальсіфікацый на прэзідэнцкіх выбарах. Як высветлілася, падчас выбараў адны і тыя ж людзі галасавалі ў розных штатах, прыходзілі галасаваць нябожчыкі, а вялізная колькасць тых, хто прагаласаваў, наогул не былі грамадзянамі краіны. Варта меркаваць, што гаворка ў выступленні Мілера наўрад ці ідзе пра тых, хто прагаласаваў за Дональда Трампа, хутчэй за ўсё, гэта яшчэ адзін удар па дэмакратах.

Раніцай 12 лютага **Паўночная Карэя запусціла чарговую балістычную ракету**. На думку экспертаў, гэта стала рэакцыяй альбо на перагаворы японскага прэм'ер-міністра з Дональдам Трампам у Вашынгтоне, альбо на заяву прэзідэнта ЗША аб тым, што нейтралізацыя ядзернай і ракетнай пагрозы з боку КНДР з'яўляецца прыярытэтнай задачай. Нагадаем, што падчас выбарчай кампаніі будучы прэзідэнт ЗША дастаткова жорстка адзываўся аб адносінах амерыканцаў з японцамі, нават параіўшы ім займець сваю ядзерную зброю, каб быць здольнымі абараніць сябе самастойна. Зразумела, з улікам гэтага візіт быў вельмі значны для Японіі. Гэтая краіна вельмі ўразлівая з пункту гледжання аддаленасці ад саюзнікаў і акружаная краінамі, насельніцтва якіх да гэтага часу не можа дараваць японцам жахаў акупацыі часоў Другой сусветнай вайны. Як і з многімі рэчамі, прадэклараванымі падчас кампаніі Дональдам Трампам, тут адбыліся важныя змены. Японскі прэм'ер-міністр атрымаў усе неабходныя запэўненні ў поўнай падтрымцы з боку амерыканцаў. Дональд Трамп выказаўся зусім недвухсэнсоўна: «Я толькі хачу, каб усе зразумелі і цалкам усвядомілі: ЗША падтрымліваюць Японію, свайго цудоўнага саюзніка, на сто працэнтаў». Ну а Паўночная Карэя, нагадаўшы пра сябе такім чынам, можа атрымаць толькі чарговыя санкцыі.

Самым важным пытаннем тыдня, пасля абвяшчэння пазіцыі ЗША, пасля якога з палёгкай уздыхнулі вядучыя эканамісты свету, сталі **адносіны ЗША і Кітая**. Нагадаю, падчас выбарчай кампаніі Дональд Трамп вельмі агрэсіўна паводзіў сябе ў адносінах да КНР, вінавацячы кітайцаў у бедах амерыканскай эканомікі. А пасля выбараў ён пачаў актыўныя кантакты з Тайванем, чаго не было ўжо гадоў сорак з лішнім у дзеяннях іншых амерыканскіх прэзідэнтаў. Усё гэта вельмі хвалявала дасведчаных у эканоміцы экспертаў, паколькі ЗША і Кітай — дзве найбуйнейшыя эканомікі свету, і прамы канфлікт паміж імі можа вельмі негатыўна адбіцца на ўсёй сусветнай эканоміцы, якая і так перажывае вельмі няпростыя часы. Але 8 лютага Трамп накіраваў Сі Цзіньпіну пісьмо, у якім заявіў, што спадзяецца на супрацоўніцтва, а 9 лютага паміж двума лідарамі адбылася размова, якую сам Трамп ахарактарызаваў на наступны дзень як «сардэчную». Таксама стала вядома, што Дональд Трамп пагадзіўся і далей прытрымлівацца палітыкі «адзінага Кітая», што зноў адсоўвае Тайвань на задворкі. Хочацца спадзявацца, што гэтая лінія будзе развівацца і далей, гарантуючы сусветнай эканоміцы засцярогу ад новых шокаў, да якіх яна не гатовая. Хоць усё яшчэ не вырашана пытанне аб тым, ці будзе Белы дом уводзіць высокія мытныя пошліны супраць кітайскіх тавараў, каб стымуляваць прамысловую вытворчасць у ЗША, як абяцаў падчас выбарчай кампаніі Трамп.

У Беларусі ў нядзелю **ўступіў у дзеянне бязвізавы рэжым з 80 краінамі свету**, грамадзяне якіх цяпер могуць наведаць нашу краіну на пяць дзён праз мінскі аэрапорт. Чакаецца, што паток турыстаў, які павялічыцца, дасць дадатковыя даходы беларускай эканоміцы і новыя стымулы для інвестыцый. Бізнесмены змогуць прыязджаць у Беларусь на перагаворы з нагоды рэалізацыі новых праектаў па першым жаданні. Будуць прыязджаць і звычайныя турысты. З часам узрасце загрузка гасцініц, больш будзе наведвальнікаў у сферы грамадскага харчавання, больш будзе купляцца сувеніраў і розных тавараў у беларускіх крамах. З часам, але не адразу, паколькі інфармацыя аб увядзенні бязвізавага рэжыму будзе распаўсюджвацца дастаткова павольна, і не ўсе ахвотныя наведаць Беларусь даведаюцца пра такую новую магчымасць зрабіць гэта без лішняга клопату ў найбліжэйшыя месяцы.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

Наблюдательный совет открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск» (г. Витебск, ул. Суворова, 16) 10 февраля 2017 г. принял решение о дате формирования реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 1 марта 2017 г. в связи с проведением очередного (годового) общего собрания акционеров 23 марта 2017 г.

УНП 300000398

# НОВЫ РЭКОРД

## Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш наведалі 55 тысяч чалавек



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Кніжная выстаўка — гэта магчымасць для кожнага беларуса сустрэцца са знаёмымі, пабачыць любімага аўтара, узяць аўтограф і прыняць удзел у прэзентацыі. Таму і Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш сёлета наведалі так многа гасцей. У гэтым годзе фактычна пабіты рэкорд па колькасці наведвальнікаў выстаўкі.**

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі, спадарыня Фіёна ГІБ** падчас цырымоніі закрыцця зазначыла:

— Вялікая пашана для нашай краіны быць ганаровым госцем Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

— Цікавасць да кнігі — у прыярытэтах работы Міністэрства інфармацыі, — заўважыў **першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.** — Гэты год вельмі важны для нас, мы адзначаем 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, таму пройдуць тэматычныя выстаўкі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Стэнд «Кнігі Беларусі» будзе паказваць усяму свету, што ў нашай краіне любяць і цэняць кнігу.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Адліга з мокрым снегам і дажджом

## А на выхадныя сіноптыкі абяцаюць удзень нават да 5 цяпла



**На гэтым тыдні ў Беларусі чакаецца няўстойлівае надвор'е, калі тэмпературны фон будзе на 2—4 градусы вышэйшы за кліматычную норму, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Першая хваля адлігі прыйдзе да нас ужо сёння, калі пад уплывам малаактыўных атмасферных франтоў на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 2 градусаў да 2 цяпла. Мокры снег з дажджом чакаецца і ўначы на сераду. А вось удзень атмасферны ціск пачне расці і ападкаў ужо не будзе. Ізноў прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог — слізка. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, а ўдзень чакаецца ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Пераважна без ападкаў прагназуецца і ў чацвер, толькі па поўначы краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, а ўдзень — мокры снег з дажджом. Будзе воблачна, слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Уначы будзе яшчэ даволі зябка, калі тэмпература паветра складзе мінус 3—9 градусаў, а пры праясненнях нават да 11 марозу. Аднак удзень ужо ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла. Атмасферныя франты і цёплыя вільготныя паветраныя масы атлантычнага паходжання будуць гаспадарыць у нас у пятніцу. Тады ўначы, пераважна па паўночна-заходняй палове, а ўдзень — амаль паўсюдна па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Магчымы слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, а ўдзень — ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя стане яшчэ цяплей. Тады на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе невялікі дождж (часам мокры снег). Слабыя туман і галалёд, месцамі на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Адліга пачне гаспадарыць нават уначы, калі тэмпература паветра складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Удзень стане ўвогуле як у сакавіку — ад 1 марозу да 5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Працяг тэмы

# ЦІ ВЕРНЕЦЦА СЫН ДА МАЦІ, ЗАЛЕЖЫЦЬ АД... ГРОШАЙ?

## У беларускі няма сродкаў, каб трапіць на суд у Германію, дзе будзе вырашацца, з кім застанецца дзіця

**Мілан, якога яго тата Мухамад у лістападзе вывез з Беларусі, знайшоўся на тэрыторыі Германіі. Выезд дзіцяці за межы краіны абмежаваны да суда, прызначанага на 6 сакавіка. Ганне, маці хлопчыка, нямецкі бок даслаў афіцыйнае запрашэнне, каб яна змагла прысутнічаць на разглядзе справы і тыдзень пабыць з малым. Такі станоўчы кірунак развіцця гісторыі псуецца толькі адным — адсутнасцю ў беларускі грошай на дарогу і пражыванне ў Германіі.**

### А адвакат бясплатны?

Нагадаем, што Мухамад, грамадзянін Лівана, на пачатку лістапада без ведама сваёй жонкі Ганны вывез іх агульнага 7-гадовага сына за мяжу, каб атрымаць статус бежанца ў Германіі. Каб адшукаць уцекачоў на тэрыторыі замежнай дзяржавы, спатрэбілася доўгая падрыхтоўчая работа па зборы дакументаў і наладжванні сувязі паміж юрыдычнымі ведамствамі дзвюх краін.

Цяпер Ганна перапісваецца з Федэральным ведамствам юстыцыі Германіі асобна, з Міністэрствам юстыцыі Беларусі — асобна. Адказы на пытанні пра тое, як вядзецца справа, нямецкі бок дубліруе і жанчыне, і міністэрству. Пры гэтым пра кожны новы ліст Мінюст інфармуе жанчыну і цікавіцца, ці патрэбна ёй дапамога па перакладзе ці тлумачэнні атрыманага дакумента.

— У Мінюсце з мяне ўзялі распіску, што я буду весці перапіску з нямецкім бокам сама, і ўсе паштовыя выдаткі бяру на сябе. Я пішу ім, атрымліваю адказы, прашу знаёмых, каб паперы перакладалі. А непасрэдна ў Германіі мае інтарэсы прадстаўляе знаёмая. Яна не адвакат, аднак я дала ёй даверанасць, каб у яе была магчымасць тэлефанаваць у нямецкае ведамства юстыцыі і пытацца, што адбываецца.

Ганна збірала паперы і дасылала іх у Германію, каб пацвердзіць, што не валодае даходам, які дазваляе аплаціць адваката. Яго паслугі каштуюць прыкладна 10 000 еўра, а канчатковая сума вырашыцца пасля завяршэння справы. Для жанчыны гэта непад'ёмная сума. Да таго ж, калі Ганна прайграе і Мілана прысудзяць пакінуць з бацькам, яна мусіць, як ёй растлумачылі, выплаціць усе расходы, якія панесла Германія пры разглядзе гэтай справы.

Ці ўлічыць суд фінансавае становішча жанчыны і выдзеліць бясплатна сацыяльнага адваката, які прадстаўляў бы інтарэсы Ганны ў судзе ў Германіі, пакуль не вырашана.

> **«Я не ведаю, адкуль мне ўзяць грошы, дзе я там буду жыць і ў колькі гэта ўрэшце мне абыдзецца. Аднак адмовіцца ад прысутнасці на судзе я таксама не магу».**

— Федэральная ведамства юстыцыі Германіі паведаміла, што адразу праінфармуе нас і Ганну, як толькі суд г. Хам вынесе рашэнне аб аказанні бясплатнай юрыдычнай дапамогі, — растлумачыла Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.

### Дарога ў Хам

Нямецкі суд прадпісаў асабісты ўдзел абодвух бацькоў у пасяджэнні пры разглядзе справы аб вяртанні Мілана. Цяпер перад Ганнай паўстала яшчэ і пытанне аплаты праезду і пражывання ў Германіі да і падчас суда.

— Юрыдычнае ведамства Германіі прапануе мне прыехаць за тыдзень да суда, каб я магла пабыць з сынам. Пры гэтым я не магу спыніцца ў знаёмых — патрэбна асобнае здымнае жыллё з магчымасцю нармальна пражываць і гатаваць ежу, і каб нікога не было побач з чужых. Я не ведаю, адкуль мне ўзяць грошы, дзе я там буду жыць і ў колькі гэта ўрэшце мне абыдзецца. Аднак адмовіцца ад прысутнасці на судзе я таксама не магу, бо ўрэшце яны спытаюцца, ці патрэбны мне ўвогуле гэты сын.

Знаёмая Ганны, якая дапамагае ёй трымаць сувязь з нямецкімі органамі юстыцыі на месцы, на судзе прысутнічаць не зможа, бо слуханне закрытае.

— На кансультацыі ў Мінюсце, калі я пыталася, за чый кошт я паеду ў Германію, калі гэта спатрэбіцца, мне вусна сказалі, што пры наяўнасці афіцыйнага запрашэння адтуль мне ўсё аплацяць. А пазней у міністэрстве мне параілі папрасіць нямецкі бок аплаціць гэтыя расходы, раз я ўжо звярталася па бясплатнага адваката.

У Міністэрстве юстыцыі Беларусі карэспандэнту «Звязды» растлумачылі:

— Нямецкі суд у лісце адзначыў, што Ганна можа падаць хадайніцтва (у нямецкі судовы орган) аб матэрыяльнай дапамозе на пакрыццё дарожных расходаў і судовых расходаў на працягу тыдня, калі выконваюцца ўмовы бясплатнай юрыдычнай дапамогі. Гэтай інфармацыяй жанчына валодае, больш таго, яна таксама атрымала такі ж ліст. Ганна сказала, што з улікам тэрміну, устаноўленага нямецкім судом, яна самастойна накіруе ў Федэральнае ведамства юстыцыі хадайніцтва аб матэрыяльнай дапамозе і адказ на ўсе пытанні нямецкага суда.

Ганна звярнулася да нямецкага боку з тлумачэннямі, што не зможа аплаціць дарогу і пражыванне ў Германіі, і папрасіла пасадзейнічаць у рашэнні фінансавага пытання. Аднак адказу пакуль не атрымала.

10 лютага Ганна адаслала электронныя лісты таксама ў Мінюст і Міністэрства замежных спраў Беларусі, дзе акрэсліла свае фінансавыя цяжкасці і папрасіла дапамогі.

— Міністэрства юстыцыі як цэнтральны орган, які дзейнічае ў межах Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей, прымае і накіроўвае на разгляд заявы, супрацоўнічае з адпаведнымі цэнтральнымі органамі замежных дзяржаў і дае інфармацыю агульнага характару адносна заканадаўства краіны аб прымяненні Канвенцыі. Іншымі функцыямі ў межах Канвенцыі Міністэрства юстыцыі не надзелена і як орган дзяржаўнага кіравання ў сферы юстыцыі не мае права прадстаўляць інтарэсы грамадзян, у прыватнасці, садзейнічаць у фінансавай дапамозе. Так што заяў аб грашовай дапамозе ад нас паступіць не магло, — запэўнілі ў Мінюсце і падкрэслілі, што знаходзяцца ў пастаянным кантакце з нямецкім ведамствам юстыцыі адносна справы гэтай сям'і.

Пасля таго як Мухамада і Мілана знайшлі ў Германіі, муж Ганны адзін раз пазваніў ёй.

— Ён угаворваў мяне вырашыць справу мірна, без суда. Я, зразумела, пагадзілася і параіла яму напісаць заяву ў дзяржструктуры Германіі, што ён дабравольна аддае мне дзіця. Ён адмовіўся і прапанаваў мне не перашкаджаць яму і даць магчымасць атрымаць у Германіі статус бежанца. Пасля, мауляў, прыедзеш да нас з Міланам і будзем жыць усе разам. Ясна, што я не пагадзілася. Пасля той размовы ён на сувязь не выходзіў.

Жанчына вельмі перажывае, што за чатыры месяцы жыцця без школы і рэжыму дня Мілану магла спадабацца такая свабода і ён скажа, што яго ўсё задавальняе. Даведацца, што думае і адчувае малы, можна толькі праўёўшы з ім той тыдзень, які прапануецца нямецкім бокам. Аплаціць стасункі з сынам у Германіі Ганне па-ранейшаму няма чым. Спадзяванні застаюцца толькі на нямецкі бок, які пагодзіцца выдаткаваць грошы. А часу да суда застаецца ўсё менш...

***P.S. Пакуль вярстаўся нумар, стала вядома, што нямецкі бок даслаў адказ: Ганне акажуць бясплатную юрыдычную дапамогу. Ёй ужо прызначылі адваката, кантакты якога паведамяць дадаткова і асабіста. Таксама ёй аплацяць дарожныя расходы ў Германію.***

***Будзем сачыць за развіццём падзей.***

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Ёсць прапанова

# НЕ ПРАПУСЦІЦЬ АНКАЛОГІЮ

**Андрэй САВОСЦІН, які сёлета заканчвае Гомельскі дзяржаўны медуніверсітэт, прапануе на рэспубліканскі конкурс «100 ідэй для Беларусі» эфектыўнае пераўтварэнне анкалагічнай службы. Сутнасць ідэі: пры стварэнні адзінай электроннай медыцынскай сеткі можна сістэматызаваць прафілактыку і лячэнне анкалагічных хворых, трымаць у полі зроку кожнага пацыента з групы рызыкі.**




— Сёння, калі папяровыя базы даных у медустановах паступова пераводзяцца на электронныя носьбіты, самы час сістэматызаваць падобную інфармацыю, браць на ўлік людзей з перадпухліннымі захворваннямі, — тлумачыць Андрэй. — Сістэмна трэба весці і самiх анкалагічных хворых. Дапусцім, жыхар Гомеля прайшоў абследаванне, а пасля пераехаў жыць у Гродна. Вынікі яго даследаванняў не павінны «губляцца». Урач любой медустановы ў любой кропцы краіны павінен мець магчымасць даведацца, якія маніпуляцыі былі выкананы і калі. Пацыента перыядычна выклікаюць для наступнага агляду, ён праходзіць неабходныя даследаванні, што дапамагае выявіць анказахворванне як мага раней.

Усё гэта, на думку будучага ўрача, дапаможа вывучэнню існуючага ўзроўню анкалагічных захворванняў у цэлым, планаванню наведванняў пацыентамі спецыяльных скрынінгавых мерапрыемстваў, прагназаванню неабходных аб'ёмаў фінансавання. «Пры розных захворваннях на анкалогію пацыенту патрэбна рознае лячэнне, таму эканамічны складнік праліччыць цяжка, але ж гэта высокатэхналагічныя аперацыі і даследаванні. Сёння магчыма распрацаваць спецыяльную праграму ўліку пацыентаў, а конкурс на такую праграму можна правесці сярод студэнтаў пры падтрымцы БРСМ», — адзначае будучы медык і падкрэслівае, што яшчэ адна мэта яго прапановы — прапаганда здаровага ладу жыцця, каб насельніцтва мела на ўвазе час правядзення неабходных працэдур. Важна ахапіць пры гэтым менавіта ўсё насельніцтва.

Усяго на рэспубліканскі конкурс «100 ідэй для Беларусі» моладзь Гомельшчыны на гэты момант падрыхтавала 14 новых прапаноў, паведамляе галоўны спецыяліст Гомельскага абласнога камітэта БРСМ Арцём Карпенка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ А вы чулі?

## Спецтранспарт для школьнікаў

### Ён увасобіў усё лепшае ад грузавіка і аўтобуса

**Мінскі аўтазавод выпусціў звышпрахodны аўтобус для сельскіх школ, які здольны свабодна перамяшчацца ў складаных дарожных умовах і пераадольваць перашкоды ў выглядзе пяскоў, лужын і гурбаў.**

Па інфармацыі ААТ «МАЗ», ён першапачаткова распрацоўваўся менавіта для сельскай мясцовасці. У адрозненне ад стандартных школьных аўтобусаў, створаных на аснове існуючых мадэляў, МАЗ-257.S30 праектавалі з «чыстага ліста». Новы спецаўтобус выйшаў больш магутным і спрытнейшым за серыйных сабратаў. Ён атрымаў рамнае шасі ад сярэднетаннажнага грузавіка. Высокі кліранс і рэсорная падвеска дазваляюць свабодна ездзіць па грунтавых дарогах. Школьны спецаўтобус абсталяваны сучасным рухавіком экалагічнага класа Еўра-5. У ім убудаваная сістэма абмежавання хуткасці. Спецаўтобус таксама атрымаў падоўжаны салон на 28 пасажыраў. Унутраная прастора падзелена на месцы для настаўнікаў і школьнікаў, прычым сядзенні для дзяцей аснашчаны чатырохкропкавымі рамянямі бяспекі. Над крэсламі арганізаваны багажныя паліцы для школьных заплечнікаў, а для першакласнікаў прадугледжана высоўная дадатковая прыступка. Інжынеры ўсталявалі ў аўтобусе мультымедыйныя сістэмы. Транспартны сродак паспяхова прайшоў выпрабаванні. Тэсты паказалі, што мадэль адпавядае ўсім патрабаванням бяспекі, якія прынятыя ў краінах СНД і Еўропы.

Першыя аўтобусы з'явяцца на сельскіх дарогах сёлета восенню. Усяго будзе выпушчана больш за 300 такіх транспартных сродкаў. Іх таксама плануецца пастаўляць на рынкі краін ЕАЭС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Выклік часу

# ЗА АДНАЎЛЯЛЬНАЙ ЭНЕРГІЯЙ БУДУЧЫНЯ

## У ТЫМ ЛІКУ І Ў НАС



**Калі заходзіць размова пра альтэрнатыўную энергетыку ў нашай краіне, прынята разводзіць рукамі. Маўляў, яшчэ не час, няма перспектыў, не дараслі. Але калі падысці да пытання аб'ектыўна, то сітуацыя выглядае зусім па-іншаму. Так, па некаторых ацэнках, патэнцыял развіцця аднаўляльных крыніц энергіі ў нашай краіне складае каля 80 мільёнаў тон умоўнага паліва ў год. Гэтая лічба перавышае агульны аб'ём спажывання энергарэсурсаў у краіне.**

На днях у Палаце прадстаўнікоў прайшоў круглы стол, прысвечаны развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі. Большасць экспертаў станоўча ацэньвалі магчымасці нашай дзяржавы ў гэтым плане. Напрыклад, патэнцыяльная эфектыўнасць выкарыстання сонечных батарэй на нашай тэрыторыі на 10% вышэй, чым у Польшчы і Нідэрландах, і на 17% вышэй, чым у Германіі, Бельгіі, Даніі, Ірландыі, Вялікабрытаніі!

### Магчымасці для бізнесу

— Развіццё аднаўляльных крыніц энергіі сёння з'яўляецца адным з найважнейшых прыярытэтаў экалагічнай і энергетычнай бяспекі краіны, — лічыць **Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.** — Што да экалагічнай бяспекі, то ў Рэспубліцы Беларусь зацверджаны нацыянальны план дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай эканомікі», дзе адным з прыярытэтаў таксама з'яўляецца ўдасканаленне і развіццё аднаўляльных крыніц энергіі. Даследаванні ўжо сёння даказалі, што дзяржава валодае сырэвіннай базай, прыродным патэнцыялам для развіцця ўсіх відаў альтэрнатыўнай энергетыкі. Гэта энергія сонца, ветру, біягазу, біямасы, водных патокаў. Цяпер вылучаюць новы від альтэрнатыўнай энергіі — геатэрмальная энергія.

Парламентарый канстатавала, што развіццё аднаўляльнай энергетыкі шчыльна звязана з развіццём эканомікі. Гэта можа даць стымул для малых і сярэдніх прадпрыемстваў, якія вырабляюць устаноўкі для аднаўляльных крыніц энергіі.

— Калі, напрыклад, узяць устаноўкі біягазу, то Беларусь валодае буйнымі жывёлагадоўчымі комплексамі, — звяртае ўвагу дэпутат. — Колькі б мы ні казалі, маўляў, вельмі доўгая акупнасць у гэтых праектаў, гэта вельмі дорага... Трэба па-іншаму ставіць пытанне: наколькі дорага абыходзяцца тыя прыродаахоўныя мерапрыемствы, якія неабходна будзе задзейнічаць? Неабходна, каб навуковая супольнасць прапанавала: якія інавацыі, якія новыя тэхналогіі і правілы неабходна ў гэтай галіне развіваць.

### ...І экспартаарыентаванай эканомікі

— Падпісана і ўступіла ў сілу Парыжскае пагадненне, — звяртае ўвагу **Сяргей ЗАЎЯЛАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыродных рэсурсаў і ахоўы навакольнага асяроддзя.** — Сёння на ўсіх узроўнях кажуць пра тое, што змяненне клімату ўплывае на ўсе сферы нашага жыцця. Па ацэнках Міжнароднага энергетычнага агенцтва, спажыванне энергіі ў свеце будзе ўзрастаць да 2050 года, але цалкам зразумела, што развівацца тымі ж тэмпамі і ў тым жа кірунку тэхналагічна энергетыка не можа. Роля аднаўляльных крыніц энергіі будзе ўзрастаць.

Прадстаўнік Мінпрыроды звярнуў увагу, што энергію сонца, ветру, вады, а таксама біямасы і біягазу сёння паспяхова выкарыстоўваюць больш за 700 установак у Беларусі.

— Неабходна разумець, што сёння энергетыка — галоўны ўкладчык у забруджванне паветра і галоўны пастаўшчык парніковых газаў у навакольнае асяроддзе. Таму тая мэта, якая пастаўлена ў канцэпцыі энергетычнай бяспекі краіны: 6% аднаўляльнай энергіі да 2020 года, — павінна быць выканана, — адзначыў Сяргей Заўялаў.

**Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** таксама лічыць, што праектам па выпрацоўцы энергіі з альтэрнатыўных крыніц у свеце надаецца вельмі вялікая ўвага.

Сёння выпрацоўка энергіі з аднаўляльных крыніц каштуе даражэй, чым у традыцыйнай энергетыцы. Аднак інвестыцыі, якія ва ўсім свеце ўкладваюцца ў гэтыя праекты, кажуць пра тое, што кошт энергіі з альтэрнатыўных крыніц будзе зніжацца. Калі ў 2004 годзе ў свеце ў праекты аднаўляльнай энергетыкі інвеставалася каля 60—70 мільярдаў долараў, то сёння гэтая лічба складае каля 300—350 млрд. Безумоўна, гэта вядзе да развіцця тэхналогій, да патаннення кошту гэтых крыніц.

— Пры гэтым, з пункту гледжання развіцця тэхналогій, гэта неблагі патэнцыял для экспарту ў нашай краіне. З улікам узроўню развіцця нашай навукі, прадпрыемстваў машынабудавання, мы маглі б у сябе распрацоўваць гэтыя тэхналогіі, рабіць рухавікі, устаноўкі і экспартаваць іх.

### Чысцейшыя, чым Еўропа?

**Уладзімір НІСЦЮК, выканаўчы дырэктар Асацыяцыі аднаўляльнай энергетыкі ў нашай краіне,** выказаўся за больш актыўнае выкарыстанне крыніц «чыстай энергіі».

— Калі кажуць пра тое, што пытанне экалогіі можна вырашыць за кошт абсталявання веласіпедных дарожак, укаранення электрычнага транспарту, то ў нейкай меры гэта праўда. Але самая вялікая праўда ў тым, што лепш за ўсё пазбаўляцца ад шкодных выкідаў укараненнем чыстых крыніц энергіі. Напрыклад, адзін ветраагрэгат магутнасцю адзін мегават за год дазваляе прадухіліць 1800 тон шкодных выкідаў. Гэта вельмі істотна. Сёння Кітай з'яўляецца сусветным лідарам па аднаўляльнай электраэнергетыцы. На другім месцы — Злучаныя Штаты. Нават Еўропа трошкі адстала... У Беларусі гэты працэс толькі набірае сілу.

**Вадзім ЗАКРЭЎСКІ, намеснік міністра энергетыкі Рэспублікі Беларусь,** каментуючы выказванне, што пазіцыі Мінэнерга і Мінпрыроды не зусім супадаюць у тым, што датычыцца экалогіі, адзначыў: абодва ведамствы кіруюцца Канцэпцыяй энергетычнай бяспекі, якая прынята ў краіне. Па яго словах, што б ні казалі, але ўзровень ахоўы прыроды ў Беларусі нашмат вышэйшы, чым у заходніх суседзяў. Уся справа ў крыніцах энергіі.

— Уся Еўропа «працуе» на вугалі і на атаме, — сказаў ён. — Усе хатнія гаспадаркі ацяпляюцца вугалем, станцыі на ім працуюць. Гэта вельмі дрэнна з пункту гледжання экалогіі. Я ўсім кажу: Цэнтральнай Еўропе — як да Месяца да экалогіі. У якасці асноўнай крыніцы энергіі ў нашай краіне на 95% выкарыстоўваецца прыродны газ. Калі праводзіць градацыю па чысціні, то самы чысты від энергіі — аднаўляльная. Пасля ідзе атамная станцыя, пасля — газ. Потым ужо вугаль, мазут — усё, чым ацяпляецца Еўропа. Таму ў іх і ёсць задачы па альтэрнатыўнай энергіі, каб усё гэта кампенсаваць. Ніколі ў жыцці яны па ўзроўні экалогіі не падбяруцца да нас.

**Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці,** упэўнены: усе вядучыя міжнародныя аналітычныя агенцтвы кажуць, што век вуглевадароднай энергетыкі скончыўся.

— Энергетыка XXI стагоддзя будзе базіравацца на трох сцэнарыях: аднаўляльная энергетыка, атамная энергетыка і тэхналогіі па назапашванні і захоўванні электрычнай энергіі. Развіццё і далейшае павелічэнне магутнасці ўстановак, якія выкарыстоўваюць выкапнёвую вуглевадародную сыравіну, застануцца ў мінулым, — заявіў выступоўца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Для шчасця неабавязкова мець рукі і ногі



Аляксей з жонкай.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Жудаснае супадзенне: здарылася бяда 8 мая — напярэдадні Свята Перамогі. Толькі праз гады гэтую дату ён пачаў называць Другім днём нараджэння.

— А літаральна за тыдзень да гэтага ўпершыню прагуляўся з дзяўчынай. Як вам гэта растлумачыць? Я быў натхнёны, унутры бурліла. Хацелася кахаць, здзяйсняць прыгожыя ўчынкі, — успамінае суразмоўца.

Ён да таго выбуху паспяхова займаўся спортам. У тым ліку вельмі паспяхова — каратэ. Было шмат планаў у спорце і жыцці. Але...

У мінскім ваенным шпіталі яму цалкам ампутавалі ногі, правую руку, ад левай засталася кукса. Спачатку думаў, што гэта ўсё проста жудасны сон. Спадзяваўся, што прачнецца — зноў убачыць сябе здаровым. Некалькі месяцаў «спрабаваў прачнуцца».

Воіны-інтэрнацыяналісты ў шпіталі маральна падтрымалі юнака. Адзін з іх таксама прайшоў праз ампутацыі... Аляксей пачынаў разумець, што і без ног, рук можна жыць. Ён шчыра ўдзячны медыкам і псіхолагам. Яны навучылі сваякоў правільна да яго ставіцца. Не шкадаваць, не «сюсюкацца», як з малым дзіцем.

Пратэзы Аляксею насіць нязручна. Таму ў горадзе і іншых мясцінах яго можна сустрэць у калясцы.

## Пачынаў бізнес з... маршруткі

З Аляксеем пазнаёміліся перад адкрыццём клубнага дома «Крылы надзеі» на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна горада Віцебска. Ён, як кіраўнік дабрачыннага фонду «Павер у сябе», паабяцаў падтрымку клубу. Яму таксама калісьці ахвяравалі грошы добрыя людзі і сацыяльна адказныя фірмы. Менавіта дабрачынная дапамога стала стартавым капіталам для адкрыцця сваёй справы.

— Перспектыва жыць на пенсію па інваліднасці і стаць абузай для сваякоў мяне не вабіла. У мяне цудоўныя бацькі, брат, малодшая за мяне на 3 гады, дзядуля і бабуля. Яны б кармілі і апранаілі, і побыт наладзілі. Але я хацеў мець уласную сям'ю і дзяцей, — працягвае Аляксей.

Калі яму было гадоў 19, ён усур'ёз задумаў заняцца бізнесам. Грошы для стартавага капіталу вырашыў патрацiць з дабрачыннага рахунку, які быў адкрыты на яго імя. Там назапасіліся пералічэнні за некалькі гадоў.



Сам наведваў кабінеты чыноўнікаў, каб аформіць паперы, гутарыў з адказнымі асобамі. Не ўтойвае, што не заўсёды, мякка кажучы, знаходзіў паразуменне. Некаторыя каля скроні круцілі пальцам: які бізнес?

— «Хай дома плача і сумуе!» — чуў. Маўляў, чаго ходзіць па кабінетах, калі ёсць сваякі? Мяне гэта злавала, але і падзадорвала, — расказвае прадпрымальнік.

Першы бізнес — маршрутка. Каб набыць аўто, ездзіў з сябрам Аляксандрам Скарбавым і яго татам у Германію. Каб сэканоміць на гатэлі, спалі ў машыне. Так былі занятыя на чужыне, што Аляксей забыўся пра свой дзень нараджэння.

— Прачнуліся ў салоне. Саша пытае: які сёння дзень? 22 студзеня? Вай, ты ж сёння імяніннік! — усміхаецца суразмоўца.

Аляксей старанна вывучыў заканадаўства, якое тычыцца бізнесу. Дапамагалі маці — былы галоўны бухгалтар — і малодшы брат Артур. Мабыць, Бог усё так наладзіў, каб малады чалавек, пасля перанесеных выпрабаванняў, меў магчымасць рэалізавацца ў жыцці.

Аляксей Талай лічыць, што вялікіх праблем для адкрыцця сваёй справы ў Беларусі няма. Ён гандляваў адзеннем на рынку, у тым ліку і «сэканд хэндам». Потым пабудаваў будынак у Оршы, каб памяшканні здаваць у арэнду. Пры гэтым сам кантраляваў усё: ад закупкі будаўнічых матэрыялаў у Віцебску да работы на аб'екце.

— Мой двухпавярховы будынак размешчаны ў цэнтры горада, каля музея і рэдакцыі газеты. Прапаноўвалі адкрыць там рэстаран і піўбар — не пагадзіўся. Я за здаровы лад жыцця. Дапамагаю сябрам у рабоце магазіна спартыўных тавараў. Мае партнёры, уладары крамы «ВелаДрайв» Аляксандр і Арцём, аказваюць дабрачынную дапамогу людзям з абмежаванымі магчымасцямі: бясплатна рамантуюць каляскі для іх, — расказвае прадпрымальнік.

Спадар Талай — член асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў. Лічыць, што стасункі з бізнесменамі вельмі карысныя: ёсць магчымасць вывучаць перадавы вопыт. Сам ахвотна кансультуе пачаткоўцаў.

Дадатковы заробак — матывацыйныя выступленні ў розных краінах. Цёпла яго прымалі і ў ЗША. Наведаў каля 30 штатаў: ад Каліфорніі да Вашынгтона. Шмат з кім пазнаёміўся. У прыватнасці, з прадстаўнікамі партый, Цэнтральнай гандлёвай палаты штата Вашынгтон. Збіраецца зноў наведаць гэтую краіну, каб сустрэцца з тымі, хто яго ведае, і наладзіць новыя сувязі.

Прызнаўся, што піша кнігу. Хацеў бы знялся ў кіно: у ролі цяжкапараненага салдата. Рыхтуецца стаць параалімпійцам у якасці плыўца.

## Пра каханне і сэнс жыцця...

Аляксей — бацька двух сыноў і дачкі. Жанаты другі раз. Пазнаёміўся са сваімі будучымі жонкамі ў інтэрнэце. З былой жонкай падтрымлівае добрыя сяброўскія адносіны.

— Я яшчэ да трагедыі хацеў быць добрым мужам і татам. Думаў, як стварыць і захаваць сям'ю. Пасля трагедыі неяк зразумеў, што магу быць цікавым для жанчын, і што ў мяне будзе сям'я. І крок за крокам адбылася рэабілітацыя ўнутры мяне. Акрамя таго, мне пашанцавала з бацькамі, таму, напэўна, марыў быць добрым сем'янінам. Тое, што са мной адбылося, навучыла: дастаткова любіць адзін аднаго, свае сем'і і бацькоў, і ўсё будзе добра, — не сумняваецца ён.

Адзін з яго жыццёвых прынцыпаў: «Калі шчаслівы сам, шчасцем падзяліся з іншым». Ён дзеліцца добрымі эмоцыямі, перажываннямі і жыццёвым вопытам з людзьмі, якія патрапілі ў цяжкую сітуацыю. Заклікае паверыць у свае сілы.

— Галоўнае, каб памкненні былі ад чыстага сэрца. Праблема становіцца праблемай, калі мы яе ўспрымаем такой. Калі выпрабаванне прыходзіць, значыць, так трэба. Усведамленне гэтага асабліва каштоўнае. Мы ў гэты свет прыходзім па вопыт. Калі б не тая трагічная выпадковасць, якая са мной адбылася, не было б мяне сённяшняга, такога, які я ёсць. А я, безумоўна, вельмі рады таму, які я ёсць зараз! — разважае Аляксей.

Ён заклікае дапамагаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі. А іх — старацца змяніць сваё жыццё да лепшага.

— У выніку вы аказваеце дапамогу яшчэ і велізарнай колькасці людзей вакол... Я магу быць прыкладам для цяжкахворых. Я падарожнічаю і выступаю, жыву поўным жыццём. Але ўсё давалася няпроста. Гэта — вынік каласальнай працы і цярпення. Усё залежыць толькі ад нас саміх. Нават невялікае намаганне здольнае перавярнуць жыццё да лепшага, падарыць радасць блізкім. А чым больш радасных людзей, тым лепей краіна, — кажа Аляксей.

Кожны новы дзень, на яго думку, — велізарны жыццёвы вопыт.

— Калі-небудзь адправімся ў свет іншы і паўстанем перад Усявышнім. Таму трэба выразна ўсведамляць, хто мы і навошта тут, — разважае ён.

Праверанная жыццём парада ад Талая: як толькі прыняў рашэнне, трэба дзейнічаць, астатнія падтрымаюць, дапамогуць ажыццявіць задуманае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Грошы

# З ГЭТЫМІ ПАПЕРКАМІ ЛЕПШ НЕ ЖАРТАВАЦЬ

## Летась у банкаўскай сістэме краіны было выяўлена ўжо 10 фальшывых беларускіх банкнот новага ўзору

Паводле інфармацыі прэс-службы Нацыянальнага банка краіны, летась спецыялісты нашай фінансавай сістэмы выявілі 1 129 падробленых грашовых знакаў, з якіх 1 122 — банкноты, 7 — манеты. У параўнанні з 2015 годам агульная колькасць падробак падробак павялічылася на 8%. У Мінску выяўлена 48,3% усіх «ліпавых» грошай, а ўвогуле падобныя паперкі былі выключаны з грашовага абароту ў 53 населеных пунктах Беларусі.

### Палова фальшывак — долары

Асноўную колькасць падробак традыцыйна склалі долары ЗША — 48,4%. Доля расійскіх рублёў у гэтым спісе — 38,8%, еўра — 10,6%, а несапраўдныя беларускія рублі па-ранейшаму сустракаліся рэдка — іх доля склала 1,7%. Таксама былі выяўлены адзінкавыя падробленыя банкноты кітайскага юаня, украінскай грыўні, фунта стэрлінгаў і польскага злотага. Эксперты падлічылі, што паводле вынікаў мінулага года прырост колькасці фальшывых долараў да агульнага паказчыка 2015 года склаў 2,2%, расійскіх рублёў — 32,7%. А вось колькасць падробных еўра і беларускіх рублёў скарацілася на 21,6% і 5% адпаведна.

Як і раней, сярод несапраўднай амерыканскай валюты значна пераважалі банкноты наміналам 100 долараў, доля якіх складала 90,3%. Падробленыя банкноты наміналам 50 долараў занялі долю ў 6,4%.

### Дамалёўваць нулі пачалі часцей

Эксперты Нацбанка паведамляюць, што з ліку выяўленых падробленых долараў ЗША 23 банкноты трапілі ў катэгорыю гібрыдных фальшывак (2015 — 21 банкнота). Яны былі выраблены з сапраўдных банкнот наміналам 1 і 5 долараў, на якіх зменены асноўныя літарна-лічбавыя малюнкі да наміналаў у 10 долараў — 3 банкноты, 20 долараў — 1 банкнота, 50 долараў — 19 банкнот. Сярод купюр падробленых расійскіх рублёў у асноўным сустракаліся банкноты наміналам 5000 і 1000 рублёў — адпаведна 71,7% і 26,7%. Прырост фальшывых банкнот наміналам 5000 расійскіх рублёў да агульнага паказчыка 2015 года склаў 51%, а наміналам 1000 рублёў — 12,5%.

### Сярод «самапальных» манет — толькі еўра

Летась сярод падробных еўра прысутнічалі ўсе наміналы банкнот, за выключэннем 5 еўра. У параўнанні з вынікамі 2015 года летась адбылося пераразмеркаванне несапраўдных банкнот еўра па наміналах. Колькасць банкнот наміналам 20 і 200 еўра скарацілася на 67,3% і 45% адпаведна, пры гэтым удвая павялічылася падробка банкнот наміналам 100 еўра. Эксперты адзначаюць, што ўсе фальшывыя металічныя грошы былі манетамі еўра, якія выявілі пры паўторным пераліку.

### Беларускія рублі «штампавалі» на прынтары

Спецыялісты рэгулятара паведамляюць, што ў мінулым годзе ў банкаўскай сістэме выяўлена 19 падробных банкнот беларускіх рублёў, 10 з якіх — фальшывыя грошы ўзору 2009 года. Нічога геніяльнага мясцовыя фальшываманетчыкі летась не выдумлялі, бо ўсе зафіксаваныя падробленыя беларускія рублі былі «адштампаваны» без імітацыі элементаў абароны.

А вось сітуацыя з падробкай замежных заходніх валют па спосабах капіравання выяў складваецца па іншым сцэнарыі. У 81% выпадкаў фальшывых долараў ЗША і 75,2% падробленых банкнот еўра яны былі выраблены з выкарыстаннем паліграфічных тэхналогій. Для рэпрадукцыі астатніх несапраўдных долараў і еўра, а таксама беларускіх і расійскіх рублёў выкарыстоўваліся прынтарныя прылады (струйны друк і электрафатаграфія).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Чулі?!

# Квадрацыкл — не для ўдзелу ў дарожным руху

## ДАІ заклікае ўладальнікаў мотаўсюдыходаў да выканання правілаў

**Апошнім часам пачасціліся выпадкі кіравання мотаўсюдыходамі, снегабалотаходамі, квадрацыкламі на аўтамабільных дарогах, засеяных палях і іншых насаджэннях.**

Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што названыя машыны ў адпаведнасці са сваімі тэхнічнымі характарыстыкамі і асаблівасцямі канструкцыі не прызначаны для ўдзелу ў дарожным руху. Разам з тым іх уладальнікі павінны выбіраць такія месцы для перамяшчэння, каб не ствараць пагрозу бяспецы грамадзян і не прычыняць шкоду навакольнаму асяроддзю, сельскагаспадарчым угоддзям.

Дзеяннем асоб, якія не выконваюць гэтыя патрабаванні, Дзяржаўтаінспекцыяй і іншымі дзяржаўнымі органамі даецца прававая ацэнка. У бягучым годзе толькі ў сталічным рэгіёне да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 10 кіроўцаў квадрацыклаў, у тым ліку за кіраванне ў стане ап'янення.

Работа па папярэджанні парушэнняў з боку кіроўцаў такой тэхнікі працягваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПА ШЛЯХАХ СУАЙЧЫННІКАЎ

**У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет кніга, прысвечаная адрасам нашых землякоў у Расіі, — «Сустрэчы з родным і блізкім»**

**Пад адной вокладкай сабраны матэрыялы, якія расказваюць пра лёсы нашых суайчыннікаў у розных рэгіёнах Расійскай Федэрацыі, пра адрасы ўшанавання іх памяці, помнікі і мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя вучоным, пісьменнікам, вайскоўцам, якія нарадзіліся ў Беларусі і жылі, працавалі ў Расіі. Асобныя старонкі — пра расіян, іх руплівасць ва ўсталяванні літаратурных, культурных сувязяў з Беларуссю, беларусамі.**




Кніга пазнаёміць чытача з адрасамі беларускай літаратуры ў Маскве (пра гэта пішуць Адам Мальдзіс і Алесь Карлюкевіч), Аляксандрам Пальмбахам, які стварыў тувінскі буквар (пра гэта піша лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алесь Марціновіч), сябрамі Беларусі з кагорты пісьменнікаў Удмурціі, Татарстана, Рэспублікі Калмыкія і іншых куточкаў Расіі.

У прадмове да кнігі «Шлях да Беларусі» старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч заўважае: «Мяркую, што выданне падштурхне да падобнага кшталту даследчыцкай, гісторыка-краязнаўчай работы і саміх прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Расіі. Яны ж ведаюць на месцах — у Татарстане, Башкартастане, Якуціі, ва Уладзівастоку і Хабараўску, іншых мясцінах бяскрайняй Расіі — хто з беларусаў, у які час засведчыў сябе ў прамысловасці і ў навуцы, у адукацыі і культуры таго ці іншага рэгіёна. І пра такіх нашых суродзічаў трэба найперш расказваць. Ужо нават дзеля таго, каб паказаць, якія годныя, вартыя сваёй Айчыны нашы землякі. Выдатна, што беларускія міністэрствы замежных спраў і інфармацыі падтрымалі праект па пашырэнні ведаў пра беларуска-расійскія лёсы нашых землякоў. Веру, што ў гэтай кнігі будзе працяг!» І далей: «Не магу некалькі слоў не сказаць пра тое, што ў сваёй заўсёднай рабоце «Выдавецкі дом «Звязда» грунтоўна ўмацоўвае беларуска-расійскія гуманітарныя сувязі. Як прыклад — і выданне кніг-альманахаў з аднолькавай, серыйнай назвай «Сугучча». Пад вокладкай гэтых зборнікаў былі прадстаўлены лепшыя пісьменніцкія сілы Расіі. У «Звяздзе» як сумесны праект з Асамблеяй народаў Расіі заснавана серыя кніг «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Выйшаў першы зборнік вершаў — «Ранішні вецер у акне» народнага паэта Удмуртыі Вячаслава Ар-Сяргі. А ў серыі «Сяброўства без межаў» пабачыла свет кніга для дзяцей народнага паэта Татарстана Роберта Мінуліна. «Звязда» выдала кнігі расійскіх пісьменнікаў Яўгенія Еўтушэнкі, Валянціна Распуціна, Аляксандра Чарняка, Валерыя Казакова, Любові Турбіной, Алеся Кажадуба, Барыса Косціна. Па сённяшні час такая руплівасць, такая ўвага да брацкай Расіі, яе культуры і літаратуры дарагога вартая».

Серыя, у якой пабачыла свет кніга «Сустрэчы з родным і блізкім», носіць назву «Адрасы Беларусі ў свеце». Спадзяёмся, што гэты кнігавыдавецкі праект пазнаёміць нас з беларускімі адрасамі і ў Польшчы, Украіне, Казахстане ды іншых старонках свету.

**Кастусь ЛЕШНІЦА**

■ Вёскі, якія знікаюць

### Немкавічы Пружанскага раёна

# І ЗІМОЙ, І ЛЕТАМ АДЗІН




**Нарэшце ў нашай рубрыцы з'явіўся мужчына! Раней апошніх жыхароў маленькіх знікаючых вёсак прадстаўлялі выключна жанчыны. Было прыемна пазнаёміцца з Міхаілам Юстынавічам ГЕРАСІМЧУКОМ. Але ж сумна, што ён застаўся адзін, зусім апошні жыхар сваіх родных Немкавічаў. Нават гадзіны гутаркі хапіла, каб упэўніцца, што 82-гадовы Міхаіл Герасімчук — чалавек з цвёрдым унутраным стрыжнем, а яшчэ з аптымізмам і пачуццём гумару.**



Расказваў, што часта перазвоньваецца з сябрам з іншай вёскі. Той таксама застаўся ўдаўцом. Дык прыяцель звычайна пачынае тэлефонную размову так: «Ну што, усё адзін сядзіш, не ажаніўся яшчэ?» На што Юстынавіч адказвае парадай з той жа оперы: «Калі хочаш памерці крыху раней свайго тэрміну, то ажаніся, ды з маладой».

— Вось так пагамонім, пасмяёмся, ды ўжо весялей. Ну яшчэ дзеці калі пазвоняць, унукі. А так усе мае забавы: два разы на тыдзень аўтакрама прыходзіць, а ў сераду і суботу газету прывозяць. Таму і дарогу заўсёды мусяць прачышчаць. Праўда, часам старшыня сельскага Савета заязджае, пазвоніць перад гэтым, а потым і зазірне, маўляў, ці жывы ты тут. А яшчэ нядаўна, недзе пад Вадохрышча аўтобус, гляджу, пад'ехаў. Думаў, якія людзі заблудзіліся. А тут выходзяць і Дзед Мароз са Снягуркай, і калядоўшчыкі, ды заспявалі, затанцавалі. Аказваецца, яны мяне прыехалі павіншаваць. Прыемна было. Не ведаю нават хто, можа, з клуба якога.

Паступова ад размовы пра забаўлянкі Міхаіл Юстынавіч пераходзіць да аповеду пра жыццё. Яно не было лёгкім. Хутчэй — наадварот. І першы ўспамін дзяцінства, што навек урэзаўся ў памяць, як зганяюць людзей, паляць вёску. Дзень 17 ліпеня 1942 года стаў трагедыйным для тутэйшых мясцін. Тады спалілі сем вёсак Мокраўскага сельсавета, з якіх расстралялі ўсіх мужчын, старэйшых за 16 гадоў. У Немкавічах загінула 58 чалавек. Міхаіл Юстынавіч помніць, як вялі пад рукі старога дзеда, бо ён сам не мог ісці, як забіралі бацьку, як галасілі жанчыны. У той дзень ён, шасцігадовы, застаўся без бацькі, а маці з трыма малымі на руках — без даху над галавой. Жылі ў іншых людзей па вёсках, з вясны да восені — у зямлянках, галадалі. У школу хадзіў урыўкамі ў адзін і той жа клас, бо ў розных вёсках, добра што чытаць-пісаць навучыўся. У 12 гадоў маці сказала, што вучыцца хопіць, пара брацца за работу, трэба сям'ю карміць. Так што касіць, араць, баранаваць давялося менавіта з гэтага ўзросту. Сястра і брат паўміралі адносна маладымі — разважае Міхаіл Юстынавіч, — мусіць, тое дзяцінства паўплывала на здароўе, вайна...

— Пасля службы ў арміі пайшоў вучыцца на трактарыста. А перад гэтым якая работа ў калгасе была, ды і першыя гады на трактары ацэньваліся працаднямі: 3 капейкі і 50 грамаў збожжа за працадзень. Маці пойдзе, і ў торбачцы ў адной руцэ прынясе тое збожжа за месяц... Потым, вядома, лепей стала. Пажаніліся мы з маёй Соняй, хату пабудавалі, дзяцей сталі гадаваць. Яна на ферме даяркай працавала, я на трактары. Усё жыццё на трактары, і на «Беларусе» — МТЗ-80, і на «Кіраўцы» — К-701 папрацаваў. Калгас наш «Чырвоны маяк» тады лічыўся не апошнім у раёне. Цяпер во ўсіх далучылі да аднаго вялікага калгаса. Раней не так было...

Міхаіл Герасімчук расказваў, як доўгі час быў звеннявым па бульбе, якія добрыя ўраджаі атрымлівалі. Ясна, што працаўніком быў наш ветэран адным з першых у гаспадарцы. Са скрыначкі ён дастае ордэн Працоўнай Славы III ступені, медаль «За доблесную працу», іншыя адзнакі сваёй механізатарскай доблесці.

Ордэн уручалі ў 1975 годзе на ўрачыстым сходзе калгаса. Было шмат народу, і прыязджыя кіраўнікі з раёна, вобласці, і аднавяскоўцы. «У наш час не такія трактары былі, як цяпер, — гаворыць ветэран. — Зараз, як вясна наступіць, трактары выходзяць, тут жа кругом палі. І я да іх падыду, пагаворым, некаторыя мяне ведаюць, з імі працаваў. У кабіне сучасных машын — чыста, вентыляцыя працуе, а кіраванне якое! А мой гусенічны некалі немалой сілы патрабаваў, каб ім кіраваць. Спачатку ў дзве змены трактар быў задзейнічаны, амаль кругласутачна на ім працавалі, ды і потым фактычна з цямна да цямна ў полі, калі пасяўная ці ўборка».

З Соф'яй Сяргееўнай выгадавалі двух сыноў. Цяпер ёсць чацвёра ўнукаў, два праўнукі. А яна, Соф'я, вось ужо хутка год, як пайшла з жыцця. З фотаздымка на сцяне паглядае маладая, надзвычай прывабная жанчына, а побач з ёй і муж, малады і прыгожы. У другой рамцы змешчаны фотаздымкі ўнукаў, адзін з іх у форме дэсантніка, зараз завяршае тэрміновую службу ў Брэсце. Як прыйдзе з войска, абавязкова наведае дзеда. Малодшы сын з нявесткай, якія жывуць у Пружанах, не рэдкія госці. А старэйшы сын, брастаўчанін, на жаль, памёр заўчасна. У Брэст паехаў адразу пасля школы, там і асеў.

— Няправільная палітыка была ў адносінах да сельскіх жыхароў пры Брэжневе, — разважае апошні жыхар Немкавічаў з вышыні сваіх 80 гадоў. — Не заахвочвалі жыць у вёсцы, наадварот, рабілі ўсё, каб маладыя ўцякалі. Ну вось, каб тады хоць крышку будавалі жыллё, можа, мой сын і яго таварышы аселі б тут, можа, не апусцелі б нашы вёскі ўшчэнт. Цяпер будуюць, многа зрабілі за апошнія 20 гадоў, але ў вялікіх вёсках, у цэнтрах калгасаў, а нашы так і засталіся паміраць.

«Ці баюся тут? А чаго баяцца, страшней смерці нічога не бывае, — па-філасофску разважае сталы чалавек. — Нейкія ж зладні лазілі па суседніх дамах. З шафаў павыварочвалі адзенне, але нічога не бралі. Няўжо яны думалі, што людзі тут золата пакінулі ў кішэнях старых лахманоў? У мяне два сабакі ды кот — вось і ўся мая ахова».

Вусаты і тоўсты, як мячык, «ахоўнік» спаў на ганку, калі мы прыйшлі да Міхаіла Юстынавіча. Невядома як ахоўваць, але добра паесці ён дакладна любіць. Гаспадар расказаў, што варыць сабе раз у два-тры дні суп, «не толькі сабе, ну і ім застаецца». Прадукты дзядуля купляе ў аўтакраме, тут ёсць усё, нават фрукты, на кухонным стале ляжалі гранат і апельсін. З малочных прадуктаў усё прывозяць, каўбасы некалькі відаў, крупы — што больш трэба. Можна нешта зрабіць паесці і на скорую руку. Якія яшчэ клопаты? Ранкам — цiск памераць ды лекі прыняць, днём — па хатняй гаспадарцы, вечарам газету пачытаць ды тэлевізар паглядзець — вось і ўвесь расклад на зімовы дзень.

Вясной, вядома, клопатаў становіцца больш, нават на ўласным агародзе. Цікаўлюся, ці на лета прыязджае нехта з суседзяў. Аказваецца, ніхто. У любую пару года Міхаіл Юстынавіч застаецца адзіным жыхаром сваіх Немкавічаў. З вясны да восені тут навокал стаіць гул машын, трактароў, бо вёска размешчана ў коле калгасных палеткаў. Як ён і казаў, людзі працуюць на палях, і для ветэрана ёсць нагода падысці, перамовіцца словам, успомніць свае працоўныя гады — парадаваць душу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*yackevich@zviazda.by*

■ Крокі да Шагала

# ПЕРААСЭНСОЎВАЮЧЫ СПАДЧЫНУ АВАНГАРДА

## На радзіме Шагала аб'явілі адкрыты конкурс «Азбука-УНОВІС»

**Як паведамілі арганізатары, пераможцы будуць вызначаныя сярод аўтараў гульнявых пляцовак і рэкрэацыйных аб'ектаў. Іх трэба прыдумаць у намінацыях: для дзятвы, моладзі, гараджан усіх узростаў. У журы запрасілі вядомых дызайнераў, архітэктараў, выкладчыкаў ВНУ. Паралельна ў інтэрнэце плануецца правесці «народнае галасаванне». Такім чынам сучасным дызайнерам, архітэктарам, мастакам, студэнтам прапануюць пераасэнсаваць спадчыну знакамітага віцебскага авангарда.**

Першы тур скончыцца 10 сакавіка. Заяўкі і эскізы аўтарскіх распрацовак чакаюць па адрасе электроннай пошты: vitebsk_ok@mail.ru. Другі тур працягнецца да 24 сакавіка.

Наталля Шыёнак, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта паведаміла, што мясцовая ўлада падтрымала ініцыятыву. І прынялі рашэнне аб правядзенні конкурсу. Ён мае і асветніцкае значэнне. Напрыклад, на радзіме Моцарта, як кажуць, з пялёнак ведаюць, што ён тут нарадзіўся. Дык хлопчыкі і дзяўчынкі Віцебска павінны з дзяцінства разумець, што калісьці тут нараджаўся авангард.



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Трамваі, упрыгожаныя выявамі, прысвечанымі УНОВІС.

Наконт месцаў, дзе могуць з'явіцца рэалізаваныя «ў камені і метале» ідэі. Ужо праяўляюць інтарэс да гэтага кіраўнікі жыллёвых таварыстваў некалькіх мікрараёнаў на ўскраіне Віцебска. Безумоўна, сучасны авангард, аўтары якога натхнёныя УНОВІСам, «ідэальна ўпішацца» і ў раёне будынка, дзе працавалі Малевіч, Лісіцкі, Чашнік, Коган і іншыя. У былым асабняку банкіра Вішняка, пра што «Звязда» не раз паведамляла, ствараецца музей — на вуліцы Марка Шагала.

Вядома, што УНОВІС («Зацвярджальнікі новага мастацтва») як авангарднае мастацкае аб'яднанне дзейнічала пры Віцебскім народным мастацкім вучылішчы. Нагадаю, навучальную ўстанову адкрылі па ініцыятыве ўпаўнаважанага Калегіі па справах мастацтваў у Віцебскай губерні Марка Шагала. Адбылося гэта ў студзені 1919 года. У пачатку лютага 1920 года ўдзельнікі суполкі паказалі пастаноўку футурыстычнай оперы «Перамога над Сонцам» і «Супрэматычны балет». Мастакі не толькі стварылі дэкарацыі і касцюмы, але і сталі рэжысёрамі, акцёрамі. У чэрвені 1920 года быў выпушчаны альманах «Уновіс №1».

Аб'яднанне мастакоў-наватараў актыўна праводзіла афармленне Віцебска. У тым ліку ўпершыню ў свеце былі распісаны і трамваі. Да гэтага ўпрыгожвалі фурманкі сялянам у абмен на ежу. Дарэчы, летась на двух трамваях і тралейбусе ў абласным цэнтры нанеслі выявы твораў авангардыстаў УНОВІС. На транспарце можна ўбачыць і партрэт Малевіча, цытаты з яго трактатаў. Цяпер, акрамя іншага, вырашылі і агучваць тэарэтычныя працы авангардыстаў падчас руху.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

■ Праблема

# Супраць фірмы няма абароны?

## Чаму вярнуць грошы за навязаны тавар сумніўнай якасці амаль нерэальна

**У наш час з'явілася шмат вопытных псіхолагаў ад нядобрасумленных фірм, якія маніпулююць чалавечымі слабасцямі. Кабета марыць пахудзець, хворы чалавек — паправіць здароўе, абмежаваны ў сродках — разбагацець. І тут з'яўляюцца яны — усмешлівыя, ветлівыя, здаровыя, маўляў, мы вырашым усе вашы праблемы.**

На скрыжаванні цэнтральных сталічных вуліц дзве жанчыны прапануюць мінакам праверыць: ці няма ў іх лішняга тлушчу. Цікавяцца вагой, ростам, надзяваюць на руку нейкі прыбор, які паказвае «перабор» з кілаграмамі, і пытаюцца нумар тэлефона: маўляў, прафесіяналы дапамогуць па найноўшых тэхналогіях вярнуць стройнасць і маладосць амаль за бясплатна. Маёй сяброўцы яны тэлефанавалі штодня, пакуль тая не згадзілася наведаць цудадзейны цэнтр. Сустрэлі яе ветліва, пасадзілі на мяккую канапу, прапанавалі каву. «Я расслабілася, адчула сябе нібы ў кумы на імянінах, — жартуе яна. — А потым пачалася апрацоўка: у вас тлушч на жываце і клубах. У нас ёсць цудадзейныя біядабаўкі, якія «спаляць» усё лішняе. А калі пры гэтым яшчэ і фітнесам будзеце займацца, то наогул праз месяц-другі станеце, як бярозка. Кошт пытання 800 рублёў. Ледзьве ўцякла ад нахабных «фірмачоў». А яны наўздагон крычалі, што не заплаціла за кансультацыю».

Аднойчы сама «купілася» на агрэсіўную рэкламу. У адной з крамаў жанчына папрасіла мяне запоўніць анкету пра тое, ці падабаецца касметыка пэўнай фірмы, і пакінуць свой нумар тэлефона. Потым пачаліся назойлівыя званкі з запрашэннем на прэзентацыю і настойлівай прапановай прывесці з сабой яшчэ некалькі чалавек.

— Сапраўды, сеткавы бізнес маніпулюе людзьмі, у аснoўным ахвярамі становяцца пажылыя людзі, жанчыны, — пагаджаецца **старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі абароны правоў спажыўцоў Васіль ВАЛАСЮК.** — У Мар'інай Горцы неяк з'явілася «брыгада», якая запрашала жыхароў наведаць навукова-практычную канферэнцыю па хваробе ног. І пажылыя людзі пацягнуліся чарадой паслухаць «дактароў». Прыемная музыка, душэўная атмасфера, размова пра тое, што баліць... А затым старым прапанавалі падпісаць дагавор на пакупку лячэбных вусцілак за 200 рублёў. Для тых, хто не меў з сабой такіх грошай, гандляры прапаноўвалі растэрміноўку праз банк. Калі я зайшоў у Дом культуры, там было недзе каля 300 пенсіянераў. Я перасцярог іх: перш, чым падпісваць дакументы, уважліва прачытайце іх. Многія пакінулі залу. Але на наступны дзень іх месца запоўнілі новыя кліенты. Справа ў тым, што тыя вусцілкі не маюць аздараўленчага эфекту, а сапраўды лячэбныя можна купіць у адпаведных секцыях магазінаў, гандлёвых цэнтраў у разы танней. Але ж людзям нібы туман вочы заслаў...

**Нядобрасумленныя фірмы цісну ць на людзей псіхалагічна, і апошнія часта вырашаюць заплаціць і забыць.**

У Ніны Васілеўны Андрэевай узялі грошы за тавар, а праз тры дні прыслалі паштоўку з маркамі і надпісам: прыклейце іх на пяткі і будзеце бегаць, як маладая. Па дапамогу ў Пухавіцкую раённую арганізацыю абароны правоў спажыўцоў звярнулася і іншая пенсіянерка, якой прадалі дзве каструлі на суму 1800 рублёў. Васіль Валасюк падрыхтаваў усе дакументы для звароту ў суд, але такія судовыя разборы, кажа ён, ідуць складана. Аналагічны працэс цягнуўся больш за тры гады, завяршэння яго пенсіянерка так і не дачакалася — памерла.

У дагаворах, аналагічных тым, якія прапаноўвалі прадаўцы цудадзейных вусцілак, ёсць пункт, што пакупнік можа вярнуць тавар назад, але пры ўмове самастойнай дастаўкі на фірму. Па-першае, самому старому чалавеку цяжка дабрацца да адрасата, які, як правіла, знаходзіцца не блізка. Па-другое, у такіх кампаніях заўсёды знойдуць зачэпку, маўляў, таварам ужо карысталіся, упакоўка парушана... Па правілах прадавец павінен адправіць рэч на экспертызу. Але нядобрасумленныя фірмы ціснуць на людзей псіхалагічна, і апошнія часта вырашаюць заплаціць і забыць.

— У 2013—2014 гадах я выйграў міжнародны праект па аказанні бясплатнай адвакацкай дапамогі па абароне парушаных правоў сацыяльна неабароненых асоб. Пасля выплаты падаткаў на суму, што засталася, здымаў офіс. Але грошы маюць уласцівасць хутка заканчвацца. На сённяшні дзень у мяне няма ні фінансаў, ні памяшкання, вымушаны выслухоўваць людзей на вуліцы, — расказаў Васіль Валасюк.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Такія судовыя разборы ідуць складана. Аналагічны працэс цягнуўся больш за тры гады, завяршэння яго пенсіянерка так і не дачакалася — памерла.**

На яго думку, новая рэдакцыя Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў» пагоршыла фінансавае становішча таварыстваў абароны правоў спажыўцоў, паставіла іх на мяжу выжывання. Паводле Закона з 2012 года гэтыя структуры працуюць з кліентамі бясплатна, у тым ліку кансультуюць, прадстаўляюць іх інтарэсы ў судах. Прычым усе расходы вяртаюцца таварыствам толькі пасля таго, як віна суб'екта гаспадарання будзе даказана. Памер расходаў вызначае Міністэрства гандлю. Разам з тым, як паказвае практыка судовых выканаўцаў, у большасці выпадкаў немагчыма спагнаць доўг з адказчыкаў па рашэнні судоў, бо на іх разліковых рахунках няма грошай, прадпрыемства ліквідавана або знаходзіцца ў стадыі банкрутства.

— Не можам мы па сваёй ініцыятыве праводзіць і праверкі выканання заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў. Такое права маем толькі ў тым выпадку, калі да нас з заявай звернецца сам пакупнік. У выніку пагоршылася сітуацыя і для шараговых спажыўцоў, — кажа Васіль Валасюк. — Штогод да нас звяртаецца 150—200 чалавек. Мы здымаем нагрузку на раённыя структуры, паколькі прадстаўляем інтарэсы спажыўцоў у судах. Разам з тым ні ад кога не атрымліваем ні матэрыяльнай, ні фінансавай дапамогі. І не маем магчымасці зарабіць самастойна.

На думку майго суразмоўцы, на базе Беларускага таварыства абароны правоў спажыўцоў варта стварыць моцную структуру з супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, антыманапольнай палітыкі, юрыстаў, якія займаліся б гэтай праблемай, рыхтавалі іскі ў суд, прадстаўлялі ў іх законныя інтарэсы падманутых пакупнікоў. Да 2012 года ў Беларускім таварыстве было 11 юрыстаў, цяпер практычна ўсе сышлі ў іншыя арганізацыі. А гэта не юрысты-тэарэтыкі, а падрыхтаваныя практыкі. «З 2005 года я за сваю працу не атрымаў ніводнай капейкі», — прызнаўся Васіль Валасюк.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by* ■


# ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «МГЦН»

извещает о проведении 17 марта 2017 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 204-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – Лесоустроительное республиканское предприятие «Белгослес»**, *тел. +375(17) 226 27 02* | | | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Прямая, 22 | 117,5 | 3,0 | 399,50 | Под административные цели (офис), торговый объект, оказание услуг | 39,90 | Отдельно стоящее одноэтажное здание (обшито вагонкой). (1*) |
| 2 | г. Минск, ул. Прямая, 22/1 | 265,8 | 3,0 | 903,72 | | 90,30 | Отдельно стоящее двухэтажное здание (из кирпича и силикатных блоков). Имеются два отдельных входа на первый этаж. (1*) |
| *1* Имеются: общий вход, канализация, отопление, водопровод, освещение, автостоянка. Подъездные пути асфальтированы* | | | | | | | |
| **Арендодатель – ОАО «Заводской райпищеторг»**, *тел.: +375(17) 219 34 72, +375(17) 219 32 16* | | | | | | | |
| 3 | г. Минск, ул. Шабаны, 14 | 1341,0 | 1,3 | 1 367,82 | Под торговый объект | 136,70 | Отдельно стоящее одноэтажное здание (год постройки – 1978). Имеются: отопление, естественное освещение, энергоснабжение, водоснабжение, канализация, санузлы, отдельный вход, система охранной сигнализации, парковка, подъездные пути, подвальные и складские помещения. Не требует ремонта. Возможно перепрофилирование |

БАВ – базовая арендная величина с 01.07.2016 составляет 13,60 рубля.

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **17 марта 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе №204 от 17.03.2017 по предмету аукциона №______**), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**
- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***
копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***
легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***
копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:
физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;
представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 17 февраля 2017 г. по 13 марта 2017 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка данный счет должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;
- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену.

Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Телефоны для справок: отдел аукционов** + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** + 375 (17) 328 36 58.

**Интернет: www.mgcn.by**

**Бібліятэка і музей Францішка Скарыны ў Лондане перажываюць новыя часы. Установа зноў атрымала афіцыйны юрыдычны статус, аднавілася работа яе апякунскай рады. Беларускія даследчыкі маюць магчымасць прыехаць у «скарынаўку», каб на месцы вывучыць тое, што іх цікавіць. Пра багатыя беларускія кніжныя калекцыі гаварылі на круглым стале, які днямі прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

1517 — 2017
У ПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА

# «КАБ ЗАХАВАЦЬ КУЛЬТУРНУЮ СПАДЧЫНУ БЕЛАРУСАЎ»

## Пра багатыя кніжныя зборы бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане

### Калекцыя, унікальная для Захаду

**Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША** адзначыў, што цяпер апякунская рада беларускай бібліятэкі ў Лондане — гэта вельмі перспектыўная каманда. У яе склад уваходзяць людзі з прафесійнай адукацыяй, тыя, хто гатовы ахвяраваць асабістым часам і сродкамі дзеля новых даследаванняў, звязаных з Беларуссю, і дзеля самой бібліятэкі. На сустрэчу ў Мінск з Вялікабрытаніі завітаў **сакратар Бібліятэчнай рады Беларускай бібліятэкі і музея імя Францыска Скарыны, магістр Ігар ІВАНОЎ**. Ён адзначыў:

— Летась я сустракаўся з Адамам Мальдзісам, а таксама Джымам Дынглі і Арнольдам Макміліным, каб запісаць іх успаміны, бо менавіта яны былі найбліжэйшымі сябрамі апякунскай рады бібліятэкі. Адаму Мальдзісу пашчасціла быць першым даследчыкам з БССР, які працаваў у скарынаўскай бібліятэцы. Больш за тое, у свой час ён паспеў стаць агентам па набыцці кніг для яе...


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
У час работы круглага стала.

— Калекцыя гэтай бібліятэкі была ўнікальнай для Захаду. Ніхто больш не мог пахваліцца такім зборам беларусістыкі, яна дагэтуль не была сабрана так сістэматычна. Збор быў унікальным і для БССР. Бо хоць практычна ўсе выданні, што знаходзіліся ў Вялікабрытаніі, меліся і ў Беларусі, але захоўваліся ў спецховах — да іх не было доступу. Менавіта ў гэты час пачынаецца ўздым англамоўных даследаванняў беларусістыкі. Ствараецца Беларуска-англійскае таварыства, якое пачынае выдаваць часопіс беларускіх даследаванняў.

### У пэўным сэнсе скарынаўская бібліятэка стала ахвярай Чарнобыля

— Перыяд росквіту змяніўся перыядам заняпаду, — працягвае Ігар Іваноў. — Бо лёс бібліятэкі быў вельмі моцна знітаваны з лёсам айца Аляксандра Надсана. Як яго здароўе рабілася слабейшым, так і жыццё бібліятэкі замірала. У 2011 годзе яна страціла статус дабрачыннай арганізацыі з-за адсутнасці справаздач аб дзейнасці. Апякунская рада практычна спыніла сваё існаванне, перакрылася і фінансаванне. Дабрачынныя сродкі, якія раней накіроўваліся на дапамогу бібліятэцы, былі перанакіраваныя людзям, пацярпелым ад Чарнобыльскай катастрофы. Літаральна нядаўна з'явілася цікавае даследаванне, з якога выявілася, што апякунская рада бібліятэкі яшчэ ў самым пачатку ахвяравала сто тысяч фунтаў на ліквідацыю наступстваў Чарнобыльскай аварыі. Таму ў пэўным сэнсе можна сказаць, што скарынаўская бібліятэка таксама стала ахвярай Чарнобыля. Гэта сумна.

— Джым Дынглі ў 2012 годзе здолеў аднавіць работу апякунскай рады бібліятэкі. У наступным годзе бібліятэцы было вернута права валодання будынкам. Шмат чаго апякунскай радзе давялося рабіць амаль з нуля. Фактычна, мы нечакана пераскочылі ад аднаго перыяду жыцця бібліятэкі да зусім іншага: ад перыяду жыцця Аляксандра Надсана, які ведаў усё і мог паказаць, што дзе знаходзіцца, да часу калектыўных рашэнняў, калі кожны ведае крыху і трэба збіраць дробязі. Ад часу папяровых калекцый мы перайшлі да часу сучасных тэхналогій, і цяпер я бачу нашмат больш цікавасці да музейнай калекцыі і архіва, чым да саміх кніг.



Выступае сакратар Бібліятэчнай рады Беларускай бібліятэкі і музея імя Францішка Скарыны (Вялікабрытанія), магістр Ігар ІВАНОЎ.

— Мы вызначыліся з місіяй і кірункамі працы бібліятэкі. Гэта захоўванне культурнай спадчыны беларусаў. Умацоўванне жыцця беларускай супольнасці ў Вялікабрытаніі праз зварот да культурных артэфактаў у розных формах. Садзейнічанне і падрыхтоўка глебы для акадэмічнага беларусазнаўства. І заахвочванне зацікаўленасці беларусамі сярод брытанскага грамадства.

— Каб дапамагаць акадэмічным даследаванням, бібліятэка заўсёды мела адпаведнае памяшканне. Можна прыязджаць і пісаць артыкулы там, чытаць і думаць. Мы аднавілі гэтыя магчымасці для зацікаўленых асоб.

### Варта апісаць архівы

**Намеснік дырэктара Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Наталля ГАРДЗІЕНКА** расказала пра багатую архіўную спадчыну бібліятэкі Францішка Скарыны, якая на сённяшні дзень вельмі слаба даследавана:

— Трапіўшы ў нашу бібліятэку ў Лондане, я была вельмі ўражана яе архіўнымі зборамі. Ад пачатку 1950-х гадоў там акумуляваліся зборы не толькі брытанскіх беларусаў — гэта фактычна быў архіў беларусаў з усяго свету. Першае паступленне адбылося яшчэ нават да яе заснавання.

— Там захоўваецца архіў дакументаў беларускай дыяспары, таксама святарскія архівы — напрыклад Льва Гарошкі і іншых. Паступалі лісты і ад грамадскіх арганізацый. Сёння там можна ўбачыць дакументы з Аўстраліі, Канады, Францыі, ЗША, Аргенціны і іншых краін. Гэта ўнікальныя сведчанні. Захоўваюцца лісты не толькі беларускіх дзеячаў, але і некаторых замежных. Маюцца паперы даваеннага часу. Усё гэта робіць архіў надзвычай каштоўным.

— Ёсць і вялікая праблема — большая частка архіва не апрацавана — гэтую справу Аляксандр Надсан пакідаў на пасля. Няма ні вопісаў уліку, ні іншых дакументаў. А гэта акурат тое, што варта было б зрабіць. Частка дакументаў патрабуе рэстаўрацыі, да таго ж умовы іх захоўвання не самыя добрыя. А гэтая калекцыя сапраўды ўнікальная.

### З пачатку XVI стагоддзя

**Вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Юрась ЛАЎРЫК** расказаў пра багатую кніжную калекцыю, якая захоўваецца ў беларускай бібліятэцы ў Лондане:

— Менавіта там змешчаны творы, выпушчаныя на Захадзе і прысвечаныя Беларусі. Маецца цікавая калекцыя старадрукаў і рукапісных кніг. Выданні па гісторыі царквы на Беларусі асабіста збіраў айцец Аляксандр. Вялікі корпус беларускай заходняй літаратуры і кніг часоў Першай сусветнай вайны, многія з гэтых кніг маюць на сабе дарчыя надпісы. Вельмі багатая калекцыя картаў, пачынаючы з XVI стагоддзя, звязаных або з нашым рэгіёнам, або з Вялікім Княствам Літоўскім...

***

Падаецца, у час 500-годдзя беларускага кнігадрукавання гэта нябачная, але такая трывалая нітка сувязі Беларусі і Вялікабрытаніі павінна стаць яшчэ мацнейшай. Праз паездкі нашых даследчыкаў да тамтэйшых кнігазбораў, праз прыём у сябе шаноўных англійскіх гасцей. Адметна, што з Лонданам нас яднае не толькі беларускі кніжны збор, але і імя асветніка Францішка Скарыны, якое яму нададзена.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# СЛОВЫ, БЛІЗКІЯ ЎСІМ

**Падчас XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі замежныя госці чыталі пераклады Скарыны на свае мовы, у тым ліку са зборніка «Скарына на мовах свету», які выйшаў у Выдавецкім доме «Звязда». І, вядома ж, дзяліліся ўражаннямі.**

**Першы сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі Генадзь ІВАНОЎ** адзначыў:

— Францыск Скарына — безумоўна, адзін з геніяў на нашых землях. Як чалавек, які першым зрабіў пэўную справу, — напрыклад, як Гагарын паляцеў у космас — безумоўна, ён з'яўляецца выдатным. Першую кнігу выдаць на ўсходнеславянскай мове — гэта вялікі подзвіг. З тых часоў, вядома, былі надрукаваны мільёны ці нават трыльёны кніг. Мы думаем, разважаем: хто ж быў першым? Але часам забываем дзякаваць за гэта...

Дырэктар Цэнтра азербайджанскай мовы і літаратуры пры БДПУ Салатын Мерзаева прачытала два вершы азербайджанскіх аўтараў. Сучасны кітайскі пісьменнік Хай І Фэн звярнуўся да прысутных на мове Паднябеснай.

— Творчасць Францыска Скарыны прымусіла па-новаму зірнуць на беларускую літаратуру, — адзначыў **старшыня Чачэнскага аддзялення Міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Клуб пісьменнікаў Каўказа» Адам АХМАТУКАЕЎ**. — Ваш першадрукар натхніў мяне па-новаму зірнуць на навакольны свет. У мінулым годзе, знаходзячыся на мерапрыемствах святкавання Дня беларускага пісьменства, я шмат чаго даведаўся пра яго. Па прыездзе дадому я пераклаў на чачэнскую мову творы Францыска Скарыны, Максіма Багдановіча і працягваю займацца перакладамі. Цяпер я інакш гляджу на беларускую літаратуру і беларускую зямлю.

Адметна, што кніжная выстаўка-кірмаш аб'яднала на сваіх пляцоўках розных людзей, якія з асаблівай павагай ставяцца да подзвігу нашага першадрукара.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.
Беларускага паэта Міколу Мятліцкага таксама натхняюць прадмовы першадрукара.

■ Спадчына ў законе

# ЧАС ВЯРТАЦЬ КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## 30 гадоў Беларускаму фонду культуры. Наперадзе — амбіцыйныя задумы

**Гэта быў час пошукаў, знаходак, расчараванняў. Але на рахунку гэтай арганізацыі — шмат карысных ініцыятыў, рэалізаваныя праекты. Да таго ж на чале БФК і сёння знаходзяцца людзі, сапраўды апантаныя справай захавання і папулярызацыі нацыянальнай спадчыны.**



**У 1950 годзе 87 партрэтаў Радзівілаў, пераважна з галерэі Нясвіжскага палаца, былі добраахвотна перададзены Польшчы. Не сённяшні дзень іх таксама можна лічыць страчанымі каштоўнасцямі.**

Пры непасрэдным удзеле фонду выдадзена восем тамоў кнігі «Вяртанне». Лёсам страчаных каштоўнасцяў асабліва занепакоены **старшыня рады Беларускага фонду культуры Уладзімір ГІЛЕП:**

— Добра, што існуе дзяржаўная камісія па вяртанні культурных каштоўнасцяў. Але, на мой погляд, гэта толькі паўкроку. Наступнае, што трэба зрабіць, — стварыць спецыяльную структуру, якая займалася б гэтым штодня. Трэба пастаянна шукаць, што дзе нашага ёсць у свеце. Патрэбна вялікая служба юрыстаў-міжнароднікаў, якая працавала б з аховай помнікаў. На сённяшні дзень у нас толькі адзін юрыст у гэтым кірунку — Эдуард Мартыненка, які штодня працуе ў Гродне, але пакуль што на сябе. Ён стаў доктарам навук, выдае кнігі адпаведнай тэматыкі. Але, маю думку, ён незапатрабаваны, трэба, каб такі спецыяліст акурат уваходзіў у структуру па вяртанні нашых каштоўнасцяў.

**Намеснік міністра культуры Васіль ЧЭРНІК**, які таксама прысутнічаў на прэс-канферэнцыі з нагоды юбілею фонду, таксама ўпэўнены, што надышоў час збіраць камяні:

— Вялікая праца праведзена: выдадзена восем тамоў кнігі «Вяртанне», у канцы 2016 года абноўлены склад камісіі па вяртанні, цяпер яе ўзначальваюць два намеснікі міністра культуры. Аднак у Рэспубліцы Беларусь адсутнічаюць нарматыўныя акты аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў. На сённяшні дзень гэта вельмі вялікая праблема для нас. У Расіі існуе такі закон. Ён мае вельмі доўгую назву «Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія аказаліся на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі пасля завяршэння Другой сусветнай вайны». Я думаю, што камісія, якая ўжо цяпер павінна збірацца і працаваць, можа паставіць пытанне аб прыняцці такога закона аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў і ў нашай краіне. Тады можна будзе вырашаць праблемныя пытанні — і з бібліятэкай Храптовічаў, якая знаходзіцца ў Кіеве, і з многімі іншымі страчанымі калекцыямі.

Шмат высілкаў кіраўніцтва арганізацыі робіць і для таго, каб паспрыяць аднаўленню старажытнага Полацка. **Дацэнт кафедры арганізацыі і кіравання БДЭУ Уладзімір ЦЯЛЕЖНІКАЎ** адзначыў:

— У 1970-я гады было зроблена нямала, каб звярнуць увагу на культурную спадчыну Полацка. Аднак сёння шмат магчымасцяў страчана. Каб не заняліся ў свой час полацкім езуіцкім калегіумам, то, пэўна, увогуле было б мала нагод ездзіць у старажытны горад. Але ж гэта наш выток, да яго трэба вяртацца. Сёння Беларускі фонд культуры праводзіць вялікую работу, спрабуе звярнуць увагу і Міністэрства культуры, і мясцовых улад на праблемы Полацка. Але, на жаль, вынікаў няма, бо статус горада зніжаны да раённага цэнтра. Гэта перакрэслівае многія нашы намаганні. Насамрэч шмат знакавага і сур'ёзнага можна было б зрабіць і за невялікія грошы пры ўдзеле грамадскасці.

**Намеснік старшыні рады Беларускага фонду культуры Анатоль БУТЭВІЧ** упэўнены, што самае вялікае дасягненне іх працы за гэты час — тое, што фонд існуе столькі часу! Аднак арганізацыя магла б мець і большыя маштабы — яе праца ў рэгіёнах сёння прыціхла. Пашырэнне працы фонду ў невялікіх гарадах магло б прынесці вялікі плён.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

---

ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

# ВАЛАДАР
## (? — 1216)



**Больш як два стагоддзі нашы продкі змагаліся з крыжакамі. Разам з беларусамі ў гэтай барацьбе ўдзельнічалі літоўцы, рускія, палякі, украінцы, латышы, эстонцы. Гэта было супрацьстаянне Захаду і Усходу. За крыжацкімі ордэнамі мечаносцаў і тэўтонцаў стаялі сілы ўсёй Заходняй Еўропы. Які лёс чакаў бы нашых продкаў, каб не перамаглі яны ў гэтай вайне?**

«Вялікі кароль Вальдэмар» — так назваў полацкага князя ордэнскі храніст Генрых Латвійскі. Толькі з яго «Хронікі Лівоніі» мы можам даведацца пра Валадара. Паводле хронікі, Валадар ужо ў 1186 годзе быў полацкім князем і правіў аж да 1216 года. Такім чынам, Валадар пракняжыў у Полацку трыццаць гадоў, што пасля славутага Усяслава Брачыславіча не ўдавалася ніводнаму князю. Ён дамогся аб'яднання ўсіх полацкіх удзельных князёў і не дапусціў міжусобнай вайны. Моц Полацкага княства выявілася ў 1195 годзе, калі палачане вызвалілі Віцебск ад улады Смаленскага княства, якое на той час лічылася адным з наймацнейшых на Русі. У 1201 годзе, калі літоўскія князі выправіліся ў рабаўніцкі паход на падуладныя Полацку землі, Валадар увёў свае войска ў Літву і прымусіў ліцвінаў адмовіцца ад паходу. Відаць, не выпадкова Валадар названы «вялікім каралём», нават крыжакі прызнавалі яго моц. Так яно і было. З'явіўшыся ў Лівоніі, крыжакі прасілі ў Валадара дазволу хрысціць падуладных яму ліваў. Полацк валодаў землямі да берагоў Балтыйскага мора, а плямёны, што жылі на іх, — лівы, селы, лэты, латгалы — плацілі даніну полацкаму князю. Каб заваяваць Лівонію, нямецкім феадалам трэба было перш за ўсё ваяваць з Полацкам. Таму крыжакі пагадзіліся плаціць Полацку даніну за падуладныя яму плямёны. Уладзімір не разгадаў гэтага палітычнага манеўру і згадзіўся з крыжацкай прапановай. Крыжакі выйгралі час і пачалі будаваць замкі, умацоўвацца, стварылі свой ордэн. А як неслі яны слова Божае, піша хроніка: «І залілі крывёю паганцаў усе дарогі і месцы»; «спустошылі і аддалі агню ўсе весі, а мужчын, якіх захапілі, усіх спалілі жывымі». Занадта позна зразумеў сваю памылку Валадар. Ордэн паспеў трывала ўсталявацца ў Лівоніі. У вусці Дзвіны была пабудавана крэпасць Рыга, якая закрыла выхад полацкім купцам у Балтыйскае мора. У 1203 годзе Валадар здзейсніў паход у Лівонію. Але крыжакі, схаваўшыся за мураваныя сцены замкаў, адбіліся. Рыжскі біскуп Альберт прызнае Валадара ўладаром Лівоніі і працягвае плаціць яму даніну, адначасова ён агнём і мячом «хрысціць» ліваў. Так доўга не магло працягвацца. Да Валадара ў 1206 годзе прыбыло ліўскае пасольства і папрасіла яго заступіцца. І гэты паход не прынёс палачанам перамогі. Крыжакі зноў абараніліся ў сваіх замках. Адчуўшы сваю сілу, Ордэн ад тактыкі ўступак Полацку пераходзіць у наступленне. Крыжакі захапілі Кукейнос і Герцыке. Альберт адмовіўся плаціць даніну. Угневаны Валадар пагражаў спаліць усе крыжацкія замкі ў Лівоніі і прагнаць крыжакоў, але перавага ўжо была на іх баку.

Народы, якія змагаліся супраць крыжакоў, бачылі ў Полацку свайго саюзніка. У 1216 годзе эсты звярнуліся да Валадара з просьбай, каб ён з войскам прыйшоў ваяваць за Рыгу. Эсты абяцалі падняць на вайну з Ордэнам паняволеныя народы. Гэта быў час, якога цярпліва чакаў Валадар, і ён пачаў збіраць войскі з Полацкай зямлі і суседняй Літвы. Калі ўсё было гатова для паходу, Уладзімір, які ўзначаліў войска, узышоўшы на карабель, раптам паваліўся і памёр. А без правадыра паход не адбыўся. Такая заўчасная смерць Валадара наводзіць на думку, што яго атруцілі ордэнскія шпегі.

Валадар — апошні полацкі князь, пра якога нешта дакладнае вядома, хоць па-ранейшаму ягоная постаць застаецца загадкавай. Нічога новага гісторыкі пра яго не могуць дадаць. І тут на дапамогу прыходзяць літаратары і мастакі. Яны вольныя выкарыстоўваць гістарычныя звесткі суадносна са сваімі творчымі задумамі. Як не нагадаць цудоўны раман Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі», у якім якраз і ўваскрашаюца расказаныя намі падзеі. Захапляльны прыгодніцкі сюжэт забяспечыў раману чытацкі поспех. Героі мінулага ажылі ў нашым уяўленні, зрабіліся больш блізкімі і зразумелымі нам. Так гісторыя ўваходзіць у сённяшняе, варта толькі ўбачыць яе.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

---

■ Традыцыі

# «ЯШЧАР-ПАНОК, АДДАЙ ВЯНОК...»

## Гульня «Яшчур» прэтэндуе на ўключэнне ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў

**Даўно прывабіла і заінтрыгавала мяне адна з загадкавых і таямнічых народных гульняў «Яшчур» («Яшчар»). Апісанняў яе даўнейшых варыянтаў, якія раней бытавалі амаль ва ўсіх кутках Беларусі, я сабраў некалькі дзясяткаў. Затым даследаваў яе таямніцы і расказаў у розных выданнях: «Гульні, забавы, ігрышчы» (1996, 2000, 2003), «Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні» (1997), «Беларуская фальклорыстыка: народныя гульні» (2014) і інш. Аднак ні разу не сустракаў гульню ў жывым аўтэнтычным выкананні.**



**Цмоку-яшчару (пасрэднікамі паміж ім і людзьмі былі вешчуны, валхвы, шаманы) людзі рабілі ахвяры, каб выпрасіць пэўныя даброты.**

Заканчэнне Каляд. І вось я разам з метадыстам Інстытута культуры Беларусі (Інбелкульт) Алёнай Каліноўскай у дарозе. Маляўнічыя краявіды Пастаўшчыны, якая выцягнулася вакол цяпер замураванай лёдам ракі Галбіяца («рака, якая цячэ па нізіне»), што згадваецца яшчэ ў прывілеі вялікага князя ВКЛ аж у 1414 годзе.

У Гуце-Голбіі нас сустракаюць супрацоўнікі Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна Л.Я. Чатовіч, навуковы супрацоўнік, і С.М. Марозава, спецыяліст па фальклоры, якія падрыхтавалі заяўку з просьбай да Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны на ўключэнне народнай гульні моладзі «Яшчар» у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Гуцкі сацыяльна-культурны цэнтр Варапаеўскага пасялковага Савета размясціўся ў былым будынку школазавода. Прасторны пакой на другім паверсе абсталяваны пад вясковую хату. Тут і збіраюцца ўдзельнікі фальклорнага гуртка, якім кіруе Тамара Маслоўская. У яго ўваходзіць моладзь вёсак Гута-Голбія, Белькі, Вайшкі, Косаўшчына, Полава, Рагоўскія, пераважна вучні старэйшых класаў мясцовых школ.

На вечарынах гуртка добры тон задае сямейны інструментальны ансамбль сям'і Пачкоўскіх з вёскі Гута-Голбія, лаўрэат абласных свят-конкурсаў «Грай, гармонік!», удзельнік розных рэспубліканскіх і іншых канцэртаў. Таленавітая музычная сям'я выкарыстоўвае двое цымбалаў, даўнейшую ліпавую карыну, аздобленую бяростай, дудку, свістулькі, бубен, трашчоткі, выробленыя рознымі мясцовымі майстрамі, дапрацаваныя і беражліва захаваныя кіраўніком А.Г. Пачкоўскім. Самаробнымі інструментамі ўмела карыстаюцца яго жонка, пляменнік, унук і тры ўнучкі (усе Пачкоўскія і Вітко — сямейны ансамбль).

Рэй у вечарыне-гульні вядзе кіраўнік гуртка Тамара Валянцінаўна (1962 год нараджэння), якая пераняла ў спадчынных гутнікаў мясцовую манеру правядзення старадаўняй гульні, што праводзілася тут не толькі на Каляды, але і на Вялікдзень, і на Купалле.

Пасярод пакоя на зэдліку сядзіць хлопец — «Яшчар», апрануты ў вывернуты кажух, шапку-аблавушку, падпяразаны дзягай. Дзяўчаты з хусткамі на плячах водзяць вакол яго карагод, спяваючы: «Сядзіць сабе Яшчар, // Гэй нам, гэй! // На залатым крэсле, // На шчаслівым месце. // Яшчар землю точыць, // Жаніцца хочыць. // Бяры сабе панну, // Ці што ў чаравічках, // Ці што невялічка, // Ці што ў атласе, // У сінім паясе». Тэкст паўтараецца столькі разоў, колькі дзяўчат у коле. Пасля кожнага выканання Яшчар забірае сабе чарговую хустку-«вянок». Затым уладар падземна-падводнага царства (па даследаваннях навукоўцаў) вяртае «згубленае» іх гаспадыням пасля таго, як яны выканаюць яго ўладны капрыз: станцаваць, некага пацалаваць і г. д. (прывабнасць і поспех гульні ў многім залежыць ад асобы, знаходлівасці Яшчара — традыцыя прадугледжвае пэўныя імправізацыі). Як і ў падобных ігрышчах, маладзёжных вечарынах, выконваліся і іншыя забавы, танцы, песні.

Гульня даўно зацікавіла навукоўцаў, асабліва расійскіх, для якіх мелі важнае значэнне найбольш кансерватыўныя варыянты зафіксаваных беларускіх песень. У іх праяўляюцца рэшткі ахвяраванне духу падземнага царства прыгожых цнатлівых дзяўчат. Вянок у фальклоры — гэта сімвал чысціні, згубіць яго — азначае стаць жанчынаю. У Старажытным Егіпце, індзейцаў Мая, Кітаі і іншых краінах ахвяравалі жывых дзяўчат, кідаючы для багоў у вадаёмы. Падобнае — і ў беларускіх гульнях. Цмоку-яшчару (пасрэднікамі паміж ім і людзьмі былі вешчуны, валхвы, шаманы) людзі рабілі ахвяры, каб выпрасіць пэўныя даброты.

Цяпер даўні сэнс магічнага дзейства страчаны, гульня выконвае эстэтычную функцыю, вяртае моладзь да традыцый продкаў, нацыянальных каштоўнасцяў, што і прадугледжвае Канвенцыя ЮНЕСКА аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Падобныя праяўленні, як адраджэнне гульні «Яшчар», неабходна падтрымліваць, ствараць умовы для іх захавання і развіцця.

**Алесь ЛОЗКА**

## ОАО «Трест Белстромремонт»

сообщает о проведении **очередного СОБРАНИЯ акционеров**, которое состоится 9 марта 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. С. Ковалевской, 61.

Регистрация акционеров (их представителей) начинается с 10.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Внесение изменений в устав Общества.
2. Отчет о результатах работы Общества за 2016 год и об основных показателях прогноза социально-экономического развития Общества на 2017 год.
3. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках за 2016 год.
4. Утверждение порядка распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2016 год, размера и даты выплаты дивидендов за 2016 год.
5. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2017 год.
6. Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
7. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии

УНП 100135597

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) по поручению
ОАО «Западэлектросетьстрой» (Продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже базы отдыха «Берег»,
расположенной по адресу: Украина, Николаевская обл.,
Очаковский р-н, с. Черноморка, ул. Костенко, 77/1.

Земельный участок площадью 1,1018 (кадастровый номер 4825184801:04:022:0004) передан ОАО «Западэлектросетьстрой» в аренду по договору аренды земли от 13.09.2006 №040602100101, соглашение о продлении договора аренды земли от 10.10.2014 №040602100101 на 10 (десять) лет.

Начальная цена без НДС – 12 900 долларов США. Задаток – 1 290 долларов США. Шаг аукциона – 5%.

Валюта торгов – доллар США. Валюта платежа – доллар США, российский рубль или белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь.

Задаток перечисляется на:

- р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369 (белорусские рубли);
- текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM.
- р/с 3012232135083, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. 04-098-340, DEUTSCHE BANK TRUST CO. AMERICAS New York SWIFT код BKTRUS33 (доллары).

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Западэлектросетьстрой», проводимом 27 февраля 2017 г.

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 23.02.2017 до 11.00 по белорусскому времени. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Аукцион состоится 27.02.2017 в 10.00 по белорусскому времени по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – 23.02.2017 в 11.00 по белорусскому времени.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.10.2014. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона: 8 10 375 (17) 306-00-57, 8 10 375 (29) 356-90-03, 8 10 375 (29) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

23 февраля 2017 года на 2-м открытом аукционе
проводит 1-й от 26 января 2017 и 13-й от 24 ноября 2016 года повторные открытые аукционы по продаже имущества
республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| **1** | Автошасси КамАЗ-5320 ш. 0393525 дв. 0835178 1991 г. 4 кат. 29264 км | г. Лида в/ч 19764. Находится в г. Береза в/ч 23324 | 4 500,00 | 450,00 |
| **2** | Автошасси Урал-375АМ ш. 449593 дв. 685514 1986 г. 4 кат. 1717 км | н.п. Лесная в/ч 52215 | 4 400,00 | 440,00 |
| **3** | Автошасси Урал-375АМ ш. 408244 дв. 983355 1983 г. 4 кат. 3259 км | н.п. Лесная в/ч 52215 | 4 400,00 | 440,00 |
| **9** | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 79094731 дв. 06КТ6669 1979 г. 4 кат. 39 708 км | г. Ст. Дороги в/ч 48668 | 21 400,00 | 2 140,00 |
| **10** | Полуприцеп-тяжеловоз ЧМЗАП-9990 ш.138 1985 г. 4 кат. 39 704 км | г. Ст. Дороги в/ч 48668 | 6 100,00 | 610,00 |
| **11** | Полуприцеп-тяжеловоз ЧМЗАП-9990 ш. 1966 1985 г. 4 кат. 12 286 км | г. Ст. Дороги в/ч 48668 | 6 100,00 | 610,00 |
| **13** | Автошасси Урал-375А ш. 381792 дв. 54541 1982 г. 4 кат. 851 км | н.п. Лесная в/ч 52215 | 4500,00 | 450,00 |
| **201** | Автошасси Урал-4320 ш. 069443 дв. 029000 1987 г. 4 кат. 2024 км | н.п. Лесная в/ч 52215 | 4 600,00 | 460,00 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **23 февраля 2017 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 20 февраля 2017 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **23 февраля 2017 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО»БПС- Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369 УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**

Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» №246 от 21 декабря 2016 г.

Утерянные представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНК №1157116 и квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №4445835–№4445840 **считать недействительными.**

УНП 100122726

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3 | | |
| **Предмет аукциона** **Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53** | | | |
| Инвентарный номер | Наименование | Назначение | Общая площадь |
| **Лот №1** | | | |
| 350/С-163612 | **Здание механизированной мойки** | здание специализированное автомобильного транспорта | 127,3 |
| Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения | | | |
| 350/С-163639 | **КПП стоянки автотранспорта** | здание нежилое | 53,2 |
| 350/С-163641 | **Навес со смотровой ямой (мехмойка)** | сооружение специализированное транспорта | 76 (смот. яма) |
| 350/С-170152 | **Очистные замазученных и ливневых вод** | сооружение специализированное водохозяйственного назначения | |
| Составные части и принадлежности: закрытый горизонтальный отстойник | | | |
| 350/С-170155 | **Дорожное покрытие** | сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства | - |
| 350/С-170153 | **Забор** | Сооружение неустановленного назначения | 386 м |
| Составные части и принадлежности: четыре ограждения, ворота | | | |
| 350/С-163618 | **Тепловая сеть** | сооружение специализированное энергетики | 148,9 м |
| Составные части и принадлежности: каналы, две опоры, камера, колодец (1 шт.) | | | |
| 350/С-163611 | **Производственный водопровод** | сооружение специализированное водохозяйственного назначения | 213,3 м |
| Составные части и принадлежности: два трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.) | | | |
| 350/С-163609 | **Дождевая канализация** | сооружение специализированное водохозяйственного назначения | 234,3 м |
| Составные части и принадлежности: четыре трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприёмник | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 384 480 руб. 00 коп.** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| 350/С-170487 | **Здание склада временного хранения** | здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 654,7 |
| 350/С-170275 | **Дорожное покрытие №982** | сооружение неустановленного назначения | 5205 |
| Составные части и принадлежности: двое ворот, калитка, забор | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,5365** га на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания склада временного хранения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 288 780 руб. 00 коп.** | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.03.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **20.03.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by | | |

## 1 МАРТА 2017 ГОДА В 10.00

в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу:
г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельного участка в частную собственность

| Номер лота | Наименование объекта | Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона | Адрес и номер контактного телефона комиссии или организации |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 14.02.2017 по 24.02.2017 с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 | 321084800019000043 площадь 0,1316 га Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №40. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1316 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 8 597,48 рубля | 786,07 рубля + расходы, связанные с опубликованием объявления | 860 рублей на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664 УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а 36 22 20 |

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за земельный участок или плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить осуществление государственной регистрации земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;

3. в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

4. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

■ Дзейныя асобы

# «ГЛІНА ДЛЯ МЯНЕ, ЯК ЛЕКІ...»



Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

**На ўскрайку прыгожай вёсачкі Соміна, якая славіцца самым глыбокім на Брэстчыне возерам (36 метраў!), жыве член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Ала КАПЫЦІЧ, майстар, дзякуючы якому адрадзіліся традыцыйныя палескія гліняныя цацкі. І не толькі.**

— Вы, можа, ці памятаеце: некалі па вуліцах ездзілі так званыя анучнікі, — успамінае Ала Фёдараўна. — Яны збіралі розную старызну, а здатчыкам прадавалі свіцёлкі ў выглядзе птушачак. Я заўсёды бегала іх купляць і потым захоўвала, як самае дарагое.

Таму не дзіва, відаць, што пасля школы дзяўчынка паступіла ў Бабруйскае мастацкае вучылішча на аддзяленне керамікі; не дзіва, што, скончыўшы яго, атрымала накіраванне ў Акадэмію мастацтваў. Праўда, вучыцца там ёй не давялося, але прафесіі дзяўчына не здрадзіла.

— Гліна бывае розная, — расказвае Ала Фёдараўна, — чырвоная, белая, блакітная, жоўтая — у залежнасці ад дабавак-мінералаў. Яе можна купіць гатовую, аднак я люблю прыродную. Сама разведала дарогу ў вёску Гарадная, што на Століншчыне, і цяпер прывожу гліну адтуль. Праўда, і туды не з пустымі рукамі ездзіла — завозіла свае цацкі. Гарадчане ім вельмі здзівіліся, а потым і самі ўзяліся рабіць. Цяпер там сучасны ганчарны цэнтр, людзі працуюць, грошы зарабляюць. Адзін ганчарны круг, што туды набылі, пад чатыры тысячы долараў каштуе. Сядзеш за такі і нават не ўмеючы нешта зробіш! Асалода за ім працаваць!

Той, за які садзіцца Ала Фёдараўна, высокі, быццам трон. Побач — міска з вадой, каб спаласкваць рукі.

Круг гудзе, рыпіць, круціцца... Невялічкі камячок гліны, як жывы, «прыслухоўваецца» да рук гаспадыні, выцягваецца, лашчыць пальцы яе далоняў — ператвараецца ў адмысловы гаршчочак.

— Вось якія мы атрымаліся! — хваліцца нарэшце майстар, трымаючы твор на шэрай мокрай далоні, і потым прызнаецца, што гліна для яе, як лекі, што ў Гарадной іх, гэтых лекаў, цэлае радовішча!

Яна сама наймае машыну і ездзіць туды за 150 кіламетраў. Сама капае і грузіць. Сама перабірае ад камянёў, каранёў і смецця... Дома замочвае ў вадзе, а «лішнюю» ў цэлафане закопвае ў зямлю на захаванне, каб потым, нават у маразы, можна было адрэзаць.

Але і тады гэта яшчэ не матэрыял: гліну трэба перацерці рукамі, замяшаць, сфармаваць у так званыя бабкі, якія потым і трапляюць на ганчарны круг.

— Працуеш і забываеш пра ўсё, — кажа майстар.

Потым, на толькі што сфармаваныя вырабы, яна запалкай, гелевым стрыжнем альбо драўляным стэкам наносіць узор і кладзе на прасушку: дробныя рэчы на суткі-паўтара, вялікія — часам на месяц, пасля чаго творы трапляюць у печ...



— Шмат клопату. А таму, напэўна, цяжка развітвацца са сваімі творамі? — пытаем у майстра.

— Так, сапраўды, жыццё іншы раз прымушае прадаваць, нават дарагія рэчы. Такіх вось лялек я зрабіла, напрыклад,толькі дзве. Рукі і ногі ў іх рухомыя, кветкі на сукенцы і пацеркі ў валасах — з гліны, вяночак таксама... Тонкая работа, укладзена столькі душы... Але я супакойваю сябе тым, што падарыла некаму радасць.

Не без таго: фігуркі птушачак, конікі, жабкі, змейкі, бабулькі на казе, дзядулі з гармонікам, Зюзя, пеўнікі... Усё эксклюзіўнае, цёплае навобмацак і нейкае роднае.

А яшчэ Ала Капыціч распісвае куфры, малюе: яе пейзажы, нацюрморты, партрэты ўпрыгожваюць сцэны дома. Аднак захапленне глінай — справа жыцця.

З апошняга Міжнароднага пленэру, на які ў Гарадную з'ехаліся майстры народнай творчасці з 12 краін свету, Ала Капыціч прывезла Дыплом пераможцы. Не першы і, вядома ж, не апошні.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы*

■

■ Чалавек — чалавеку

## Рэцэпт «палымянага кахання»

**Яшчэ гадоў 15 таму ў Беларусі пра дзень Святога Валянціна нямнат што ведалі. Але ж цяпер факт застаецца фактам — свята прыжылося, а значыць, і нашы закаханыя (незалежна ад узросту) дораць сваім палавінкам адмысловыя паштоўкі, шакалад, кветкі, розную мілую драбязу; думаюць, што прыгатаваць...**

А між тым у краінах Скандынавіі ёсць завядзёнка ў гэты дзень падаваць адну вельмі... нашу страву. Называецца яна «палымянае каханне». Рэцэпт больш чым просты: са зваранай бульбы робіцца звычайнае пюрэ. Зверху яно «пасыпаецца» кавалачкамі бекону, падсмажанымі разам з цыбулькай, потым — дробна парэзанай пятрушкай. А наверх на гэту смакату кладуцца пласцінкі марынаваных бурачкоў, якія сімвалізуюць сабой сэрца, што палае ад кахання.

Простая страва? Так. Смачная? Вельмі. А калі яшчэ і гатаваць яе са шчырай любоўю, то на яе, як мне здаецца, проста грэх не адказаць — узаемнасцю.

**Наталля РУЖЫЦКАЯ,** *г. Мінск*

■

■ Рабі, як мы

## «БЕЗ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ НЕ БУДЗЕ ВЕЧНАСЦІ»

**Пры нашым дзіцячым садзе — сярэдняй школе не адно дзесяцігоддзе існуе клуб «Міласэрнасць». Яго задача — дапамагаць састарэлым, на справе клапаціцца пра тых, хто застаўся зусім адзінокім.**

Зіма і сапраўды час, які выпрабоўвае людзей на трываласць. Таму цяпер вучні 5—11 класаў кожны тыдзень (а калі ёсць неабходнасць, то і часцей) наведваюць сваіх падшэфных. Раней гэта былі ў асноўным ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, цяпер — ветэраны працы. Яны ведаюць, хто і калі да іх завітае, да каго можна звярнуцца з просьбай згрэбці лісце, скласці дровы і г.д. У зімовы час «графік наведвання» вызначае само надвор'е. Пасля снегападаў, напрыклад, дзеці разам з класнымі кіраўнікамі заходзяць да сваіх падшэфных, каб расчысціць сцежкі, нанасіць у хаты дроў...

Але ж не толькі. Як паказвае вопыт сустрэч, нашым пажылым, апроч дапамогі, патрэбны і звычайныя чалавечыя зносіны. Яны ахвотна расказваюць дзецям, як выжывалі пасля вайны, як вучыліся ў школе, што шанавалі і чым ганарыліся, як ваявалі іхнія бацькі...

Усё пачутае выхоўвае ў дзецях пачуцце спагады, вучыць дабрыні і чалавечнасці, без якой, паводле Пімена Панчанкі, не будзе вечнасці.

**Валянціна ЕМЕЛЬЯНОВІЧ,**
**класны кіраўнік 8-га класа,**
*в. Мілевічы, Жыткавіцкі раён*

■



■ Пасля пісьма

## У цеснаце? У крыўдзе...

**Пад такім загалоўкам у нумары «Звязды» ад 24 снежня 2016 года быў змешчаны ліст спадара Анатоля Мазго, у якім выказваліся прэтэнзіі да якасці перавозкі пасажыраў цягнікамі эканом-класа па маршруце Барысаў—Мінск.**

Публікацыя, як паведаміў **намеснік начальніка Беларускай чыгункі У.В. БАЛАХОНАЎ,** разгледжана, і па сутнасці пытання паведамляецца, што (цытата) «з цягніком рэгіянальных ліній эканом-класа № 7001 Барысаў—Мінск з 23.12.2016 штодзённа эксплуатуюцца электрацягнікі серыі ЭР9 прыпіскі маторвагоннага дэпо Мінск, якія маюць у сваім саставе 10 вагонаў.

У мэтах скарачэння эксплуатацыйных выдаткаў у сувязі з сезонным зніжэннем пасажырапатоку Беларускай чыгункай перыядычна праводзіцца... змяншэнне даўжыні саставу да 8 вагонаў.

У адпаведнасці з існуючым раскладам руху цягнікоў гарадскіх і рэгіянальных ліній, абслугоўванне цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа Барысаў—Мінск можа ажыццяўляцца электрацягнікамі серыі ЭР9, якія маюць у сваім саставе 8 альбо 10 вагонаў.

Цягнік рэгіянальных ліній № 7001 адносіцца да катэгорыі эканом-класа. У цягніках гэтай катэгорыі ўзровень абслугоўвання пасажыраў і ўмовы іх праезду адпавядаюць існуючаму фармату пасажырскіх перавозак.

Просім прабачэння за прычыненыя нязручнасці і спадзяёмся, што карыстанне чыгуначным транспартам будзе выклікаць у пасажыраў толькі пазітыўныя ўражанні»

■ Кватэрнае пытанне

## НЕ АБАВЯЗАНЫ, АЛЕ ПРАВА МАЕ

***Два гады таму наша дачка выйшла замуж, пераехала з мужам на прыватную кватэру. Але плаціць за яе вельмі дорага. Таму мы, бацькі, дапамаглі маладым купіць сваю аднапакаёўку ў доме ЖБК. Ранейшы ўласнік кватэры быў членам кааператыва з пачатку будаўніцтва. У нас пытанне: ці павінны новыя ўласнікі жылля ўступаць у ЖБК? Што будзе, калі не ўступяць?***

**Л. БОЛАТАЎ,** *г. Магілёў.*

Пытанні членства ў ЖБК рэгламентаваны арт. 193 Жыллёвага кодэкса (далей — ЖК), які не змяшчае патрабавання аб абавязковым уступленні ў кааператыў новых уласнікаў жылых памяшканняў у доме ЖБК і не прадугледжвае якіх-небудзь наступстваў для тых, хто ў кааператыў не ўступіць.

Нагадаем, што ў адпаведнасці з арт. 193 ЖК пры пераходзе права ўласнасці на аб'екты нерухомай маёмасці да іншага грамадзяніна, юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка новы ўласнік мае права ўступіць у члены арганізацыі забудоўшчыкаў, падаўшы адпаведную заяву ў праўленне гэтай арганізацыі. Ён становіцца членам арганізацыі забудоўшчыкаў з даты рэгістрацыі такой заявы ў праўленні арганізацыі забудоўшчыкаў. У гэтым выпадку прыняцця рашэння агульным сходам (сходам упаўнаважаных) членаў арганізацыі забудоўшчыкаў не патрабуецца.

У адпаведнасці з п. 2 арт. 201 ЖК уласнік аб'ектаў нерухомай маёмасці, які не з'яўляецца членам арганізацыі забудоўшчыкаў, абавязаны выконваць патрабаванні жыллёвага заканадаўства, правілы карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, а таксама выконваць рашэнні агульнага сходу (сходу ўпаўнаважаных) членаў арганізацыі забудоўшчыкаў, іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам.

Згодна з п. 1 арт. 201 ЖК уласнік, які не з'яўляецца членам арганізацыі забудоўшчыкаў, мае права ўступіць у гэтую арганізацыю ў любы час.

**Віктар САВІЦКІ**

# ДАРЫ АД «СТАДАРА» — ДЛЯ ЗША І ІЗРАІЛЯ

СтаДар



Галоўны тэхнолаг Аксана ЦЕЛЕШ прадставіла нам папулярныя сярод спажыўцоў вырабы.

**Наша газета часта расказвае пра справы на адным з флагманаў айчыннай індустрыі — Слуцкім цукровурафінадным камбінаце. Тут яшчэ ў снежні завяршылі сезон перапрацоўкі цукровых буракоў, зараз вядзецца рамонт тэхналагічнага абсталявання. Калектыў жыве цікавым, насычаным жыццём.**

У адной з публікацый з акцыянернага таварыства мы расказвалі аб тым, што рашэннем Мінскага аблвыканкама камбінату перададзены Старадарожскі плодаагародніны завод, які апынуўся на грані банкруцтва. Прайшоў час. І вось адна за адной пачалі паступаць прыемныя навіны. Спачатку старадарожцы прывезлі з 2-й Міжнароднай спецыялізаванай выставы-кірмашу «Свет прадуктаў» залатыя медалі ў намінацыях «Якасць і натуральнасць» і «Народная дэгустацыя», дыплом за лепшае прасоўванне айчыннай прадукцыі. А потым узнагароды пасыпаліся як з рога дастатку: найвышэйшыя ацэнкі журы прэстыжнага конкурсу адразу пяці відам нектараў і варэння з клубніц і вішняў; сярэбраны медаль «ПРАДЭКСПА»; ганаровае званне «Лідар года 2015» за шырокі асартымент і высокую якасць сокаў, нектараў, павідла; нядаўняя перамога ў конкурсах «Прадукт года» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь 2016 года»...

І вось мы даведаліся, што новы медаль (залаты, за нектары з буякоў з мякаццю і з морквы з мякаццю), дыпломы і дзелавыя кантакты сталі вынікам знакамітай выстаўкі «Прадэкспа-2017», якая літаральна на мінулым тыдні прайшла ў Маскве. Што ж, пара збірацца ў Старыя Дарогі.

Мы сустрэліся з **дырэктарам плодаагародніннага завода**, што атрымаў «другое жыццё», **Віталем МАРКАЎЦОМ**.

***— Якім чынам «ляжачае» прадпрыемства набыло вытворчую моц і ператварылася ў нармальна функцыянуючы калектыў, Віталь Уладзіміравіч?***

— Гэта адбылося не раптам, а перш за ўсё дзякуючы істотнаму ўкладу ў яго развіццё з боку кіраўніцтва Слуцкага цукровурафінаднага камбіната. Мы сталі паўнавартасным унітарным прадпрыемствам камбіната, бо адразу пачалі выкарыстоўваць яго прадукцыю, вопыт яго тэхнолагаў і шматгадовыя напрацоўкі маркетолагаў. Першы час дырэктар галаўнога прадпрыемства Мікалай Паўлавіч Пруднік, старшыня назіральнага савета акцыянернага таварыства Восіп Іосіфавіч Дапіра, амаль усе галоўныя спецыялісты і многія спецыялісты са Слуцка бывалі тут пастаянна. Дапамога была аказана як фінансамі, што дазволіла ў кароткія тэрміны пагасіць значныя даўгі па крэдытах, — мы іх бралі пад рэканструкцыю, так і тэхналагічнай, арганізацыйнай, рынкавай дасведчанасцю работнікаў аддзелаў і службаў. Дзякуючы гэтаму мы змаглі наладзіць устойлівы выпуск высакаякаснай прадукцыі і яе рэалізацыю, заняць сваю нішу перш за ўсё на ўнутраным рынку, а потым паступова заявіць аб сабе і на знешнім.

Фундаментам для паспяховых тэхналогій стала, канешне ж, праведзеная карэнная рэканструкцыя завода, заснаванага яшчэ ў 60-я гады, — працягвае свой аповед дырэктар. — Бо было закуплена і ўстаноўлена новае высокапрадукцыйнае абсталяванне, перш за ўсё балгарскія лініі па вытворчасці прадукцыі ў шклатары. Аўтаматызавалі цалкам увесь працэс — ад прыёмкі сыравіны, яе падрыхтоўкі і перапрацоўкі да атрымання канчатковага прадукту. Запрацавалі лініі па моркве (у нас ёсць пазіцыя «морква — гарбузы»), па агародніне, ягадныя лініі і так званай фруктовай групы. А ўсё гэта ў выніку — высакаякасныя сокі, у тым ліку з мякаццю, джэмы і іншая вітамінная прадукцыя.

Раней у нас не было варэння. Давялося асвойваць тэхналогію прыгатавання варэння з цэлымі ягадамі, а гэта даволі далікатны працэс. На той час сумесна з кіраўніцтвам цукровурафінаднага камбіната было прынята стратэгічна важнае рашэнне: завязаць усю нашу вытворчасць у асноўным на мясцовых відах сыравіны — нарыхтаванай у Старадарожскім ці суседніх раёнах, а не завазных. І без нас хапае вытворцаў прадукцыі з абрыкосаў ці ананасаў, мы клапоцімся пра беларускі прадукт і даём яму рады. Прасоўваць на рынках клубніцы ці парэчкі не менш пачэсна і эфектыўна па грашах.

Справа яшчэ і ў тым, што імпартная сыравіна схільная да хістанняў курсавых розніц валют, і працаваць



Кіраўнік прадпрыемства Віталь МАРКАВЕЦ з прызам «Крыштальны яблык» — узнагародай, атрыманай на рэспубліканскім конкурсе.

па цане з ёю праблематычна. Грунтуючыся на беларускіх грашах, мы можам прагназаваць і ажыццяўляць закупачную і цэнавую палітыку нават на паўгода наперад. Такая наша цэнавая стабільнасць вельмі важная і для гандлёвых сетак, і для пакупніка.

Сезон нарыхтоўкі доўжыцца з чэрвеня па снежань. Пастаўшчыкамі з'яўляюцца мясцовае насельніцтва — праз арганізаваныя прыёмныя пункты, а таксама фермерскія гаспадаркі, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — такія, як агракамбінат «Ждановічы», структуры «Белкаапсаюза». Нарыхтоўваем садовыя і дзікарослыя, лясныя ягады: клубніцы, чарніцы, суніцы, чорныя парэчкі, чарнаплодную рабіну, сліву, брусніцы, журавіны... Часткова перапрацоўваем у фруктовае і агародніннае пюрэ, у замарожаным выглядзе яно захоўваецца ў халадзільных камерах. Ягада выкарыстоўваецца для вырабу працёртых вітамінных далікатэсаў, варэння. З пюрэ таксама вырабляем нектары, сокі і морсы. А ў сакавіку пачынае ісці бярозавы сок, які мы фасуем у цэлафанавыя мяшкі, а затым пастаўляем яго і прадукцыю з яго спажыўцам, у тым ліку за мяжу. Дарэчы, на сок бярозавы, чарніцы, брусніцы, журавіны і прадукты іх перапрацоўкі ёсць сертыфікаты адпаведнасці еўрапейскім стандартам якасці.

Што датычыць далейшай асартыментнай палітыкі, то тут дыктуе свае ўмовы рынак. Нават калі б мы захацелі звузіць асартымент, які ўжо ўстаяўся, каб зменшыць вытворчыя выдаткі і мець менш клопату, то не атрымаецца, бо разумеем: стоячы на месцы, спынішся ў сваім развіцці. І пакупнікі не даюць засяродзіцца толькі на дасягнутым — паступаюць заказы на прадукцыю, якая спадабалася, нейкія пажаданні, да якіх мы стараемся прыслухоўвацца.

Менавіта ідучы насустрач запытам пакупніка, асвойвалі зусім нядаўна і новыя віды прадукцыі — напрыклад, варэнне без цукру. Яго можна замяніць сарбітам, канцэнтраваным яблычным сокам, а гэта таксама цукар, фруктоза. І што яшчэ важна — сучасныя тэхналогіі дазваляюць захаваць гатовы прадукт без кансервантаў — у прывычным іх разуменні. Бо існуюць пастэрызацыя і стэрылізацыя, а кансервантамі ў нас служаць той жа цукар, соль і некаторыя спецыі, калі размова ідзе пра соусную групу. Так што прадукцыя максімальна натуральная.

Такая наша пазіцыя зацікавіла спажыўцоў нават з далёкага замежжа, дзе пры вытворчасці харчовай прадукцыі шмат выкарыстоўваецца розных Е-дабавак, стабілізатараў і кансервантаў. Пасля нашага ўдзелу ў выставах пра вітамінную скарбонку з гандлёвай маркай «СтаДар» даведаліся, у прыватнасці, ізраільскія фірмы. Прыязджалі ад іх спецыялісты, знаёміліся з нашай вытворчасцю, праводзілі сертыфікацыю. Прыйшлі да высновы, што наша прадукцыя адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да кашэрнай. А гэта ўжо, згадзіцеся, вышэйшы пілатаж. Зараз разгортваецца супрацоўніцтва.

— Вельмі вялікая ўвага ўдзяляецца аздараўленчаму харчаванню, — уступае ў размову **намеснік начальніка аддзела збыту плодаагародніннай прадукцыі Слуцкага цукровурафінаднага камбіната Ала ШАПАВАЛАВА**. — Хацела б выдзеліць якраз лінейку прадуктаў, прыгатаваных без цукру. Людзі, якія хварэюць на дыябет, удзячны старадарожскаму заводу. Калі не памыляюся, сок бярозавы без цукру быў упершыню распрацаваны менавіта тут. Ён разліваецца ў шкляныя слоічкі аб'ёмам як 0,73 літра, так і ў бутэлечкі 0,25. Зручна, калі патрэбна ўзяць з сабой у дарогу ці падсілкаваць дзіця. Выпускаем сок бярозава-яблычны без цукру, а сёлета асвоілі яблычны без цукру. Па імпартазамяшчэнні — сок гранатавы без цукру.

Асобна варта сказаць пра лінейку агародніннай прадукцыі. Нектары агародніння, як гарбузова-маркоўны ў чыстым выглядзе, так і такія міксы, як морква-вішня, морква-клубніцы, морква-маліна, заваявалі свайго ўстойлівага спажыўца. Маючы незвычайны смакавы «букет» і расфасаваныя ў шкляныя бутэлечкі 0,25, яны разыходзяцца цудоўна. У тым ліку і праз Еўраопт. А што датычыцца маркоўна-яблычнага соку аб'ёмам 0,73, то гэта наш брэнд на працягу некалькіх гадоў.

Ёсць лінейка прадукцыі, якую мы жартам называем аптычнай за станоўчае ўздзеянне на вочы: нектар чарнічны, нектары з буякоў, з чорных парэчак і чарнаплоднай рабіны.

У мінулым годзе распрацавалі новую гандлёвую марку варэння пад назвай «Сёлета». Уклалі ў гэты праект шмат старання, таму верым у яго паспяховасць. Як і ўвогуле ў паспяховасць усяго, што старадарожцы робяць разам з цукровурафінадным камбінатам.

— Працуем і над павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці, — дадае дырэктар. — Магчыма, аб'ёмы растуць не так хутка, як нам хацелася б, але тэндэнцыя да росту ёсць, і яна адчувальная. Як на экспарт, так і для ўнутранага рынку. У нас свой рэгіён, пакупніцкая здольнасць насельніцтва служыць пэўным арыенцірам. Пастаўляем прадукцыю ў асноўным у суседнія раёны сваёй вобласці, хоць ёсць яна і на Магілёўшчыне і Гомельшчыне, ды і фактычна ва ўсёй Беларусі.

Па экспарце ў нас шматвектарная палітыка, імкнёмся ахопліваць розныя напрамкі. Доля паставак у Расію складае каля 50 працэнтаў, ахоплены многія рэгіёны ўсходняй суседкі, нават Новасібірск і Уладзівасток. Скажам, у далёкай Чыце існуе сетка магазінаў «Чыцінка», дзе шырока прадстаўлена наша прадукцыя. Але асноўная маса вітамінных прысмакаў ідзе ў Санкт-Пецярбург і Маскву.

Нядаўна пробную партыю свайго варэння адправілі ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Першы кантракт заключаны на неблагую суму грошай.

— Прадукцыя завода прадстаўлена ва ўсіх гандлёвых сетках краіны, — адказвае на пытанне пра партнёрства з гандлем Ала Шапавалава. — А таксама ў рознічным гандлі і спажывецкай кааперацыі. Супрацоўнічаем таксама з камбінатамі школьнага харчавання, санаторнымі ўстановамі, бальніцамі. Мы хацелі б, канешне, каб прадукцыя адроджанага прадпрыемства не проста прысутнічала ў гандлі, але была прыкметная, выстаўлена на першых пазіцыях, як яна таго заслугоўвае. Тады ад яе вачэй не адвесці. Вельмі задаволены сваім супрацоўніцтвам з такімі сеткамі, як «Карона», БІГЗ, «Марцін», — заўсёды з разуменнем адносяцца да нашых пажаданняў па расстаноўцы прадукцыі, своечасова пераводзяць грошы за рэалізаваны тавар.

Прадпрыемства сертыфікавана па сістэме ISO, і згодна з патрабаваннямі стандартаў наладжаны ўваходны кантроль за сыравінай (у тым ліку за ўтрыманнем шкодных рэчываў) і вядзецца кантроль якасці прадукцыі на ўсіх этапах вытворчасці. Адказна і прафесійна працуюць работнікі грунтоўна абсталяванай лабараторыі. На заводзе ўшчыльную прыступілі да ўкаранення ХАССП. А для еўрапейскага рынку атрымалі сертыфікат на біяпрадукцыю, пацверджаны адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

На прадпрыемстве людзі ў асноўным працуюць мясцовыя, якія прайшлі навучанне і атрымалі належны досвед. Частка спецыялістаў прыязджаюць са Слуцка, наладжана дастаўка заводскім транспартам. Працуюць і выпускнікі Слуцкага каледжа харчовай прамысловасці. Хоць практыку праходзяць і студэнты іншых профільных навучальных устаноў, едуць нават з Магілёва, некаторыя потым застаюцца працаваць. Спецыялісты імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю, якраз у гэтыя дні двое з іх абаранілі дыпломы пасля заканчэння інстытута і магістратуры.

Калектыў стараецца. Калі паспрабаваць назваць лепшых, то спіс атрымаецца вялікім. Назавём у першую чаргу тых, каго прадставілі на раённую Дошку гонару: варшчыка 5-га разраду Таццяну Анатолеўну Жукавец, вядучага інжынера-механіка Генадзя Юльянавіча Бахановіча.

У калектыве бачаць перспектывы для далейшага росту. Тут узялі кірунак на ўпакоўку толькі ў шкляных бутэльках і слоічках розных памераў. Бо лічаць, што толькі шкло здольнае захаваць спажыўныя якасці далікатнай вітаміннай прадукцыі — на працягу да двух гадоў нават без выкарыстання любых кансервантаў. Спадзяюцца, што пастаўшчык шкляной тары пераажыве складаныя для сябе часы і будзе забяспечваць завод тарай у поўным аб'ёме, каб не завозіць з-за мяжы. І з дапамогай дзяржавы вырашыцца пытанне збору зваротнай шклатары, як гэта змаглі зрабіць суседзі ў Прыбалтыцы.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**




— Усё, што выробляе «СтаДар», ёсць у краме «Слуцкі цукар», — запэўніла прадавец Святлана ЕРМАЛІЦКАЯ.

**БЕЗ САХАРА**



За работай аўтаклава сочыць апаратчык Галіна АМЯЛЬЧУК.

УНП 600075003

# НЯПРОШАНЫЯ ГОСЦІ



## Чаму Стары Свет кардынальна «перавярстаў» міграцыйную палітыку?

**Германія здзейсніла рэзкі паварот у міграцыйнай палітыцы. Нямецкі ўрад падрыхтаваў меры па паскарэнні дэпартацыі тых, каму было адмоўлена ў атрыманні статусу бежанца. У прыватнасці, улады ФРГ маюць намер стварыць адмысловыя «дэпартацыйныя цэнтры» для сістэматызацыі адпраўкі людзей дадому. Таксама прапануецца фінансава заахвочваць тых, хто вырашыў добраахвотна вярнуцца на радзіму, і ўзмацняць ціск на кіраўніцтва краін, якія адмаўляюцца прымаць сваіх грамадзян. Больш жорсткай стала міграцыйная палітыка і ў шэрагу іншых еўрапейскіх краін, якія дагэтуль займалі лаяльныя пазіцыі ў дачыненні да бежанцаў. Чаму так рэзка змяняецца еўрапейскі міграцыйны трэнд?**

### 24 МІГРАНТЫ Ў ХВІЛІНУ

Маштабы вымушанага перасялення людзей у свеце дасягнулі рэкорднага ўзроўню, сцвярджаецца ў дакладзе ўпраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. Эксперты кампетэнтна заяўляюць, што кожную хвіліну ў свеце 24 чалавекі становяцца прымусовымі перасяленцамі. У выніку войнаў і пераследванняў усё большай колькасці людзей даводзіцца пакідаць свае дамы. І гэта ў той час, калі многія краіны закрываюць свае межы перад мігрантамі. Палова ўсіх бежанцаў — дзеці, многія з якіх пры спробе знайсці прытулак разлучаюцца з сем'ямі.

Спецыялісты Цэнтра развіцця пры Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) падлічылі, што ў перыяд з 1995-га па 2015 год агульная колькасць перасяленцаў ва ўсім свеце павялічылася на 85 млн чалавек, і агульная колькасць мігрантаў у глабальным маштабе дасягнула 245 млн. Высокія даходы і дабрабыт з'яўляюцца галоўнымі фактарамі, якія прыцягваюць перасяленцаў. Розніца паміж краінамі, што развіваюцца, і развітымі краінамі ў сярэднегадавых даходах на душу насельніцтва паступова павялічвалася: з 1995-га па 2015 год гэтая розніца павялічылася з $20 тыс. да $35 тыс. Даклад таксама сведчыць, што з-за пагроз узброеных сутыкненняў і гвалту міграцыйны крызіс дасягнуў гістарычнага піка. Да канца 2015 года агульная колькасць бежанцаў ва ўсім свеце дасягнула 16,1 млн чалавек. Палова гэтых людзей прыехалі з Сірыі, Афганістана і Самалі. У дакуменце падкрэсліваецца, што хоць міграцыйны крызіс аказвае прыкметны ўплыў на Еўропу, аднак насамрэч яго асноўнаму ўздзеянню падвяргаюцца дзяржавы, якія развіваюцца. 87 працэнтаў бежанцаў жывуць у сярэднедаходных і нізкадаходных краінах. Больш за ўсё мігрантаў прынялі Турцыя, Пакістан і Лівія.

### НА ШАЛЯХ ЭКАНОМІКІ

Відавочна, што еўрапейскі бізнес мае патрэбу ў рабочых мігрантах. Паводле звестак Еўрапейскай статыстычнай службы, рост насельніцтва Старога Свету ў апошнія гады адбываецца ў асноўным за іх кошт — у сярэднім за год на 500 тыс. чалавек. «Па прагнозах Еўракамісіі, колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва ЕС паменшыцца да 2020 года на 7,5 млн чалавек, або на 2,2%, а без уліку міграцыі — на 11,7 млн, або на 3,5%. Таму прапануецца садзейнічаць працоўнай рухомасці ўнутры Еўрасаюза, а таксама аптымізаваць колькасць і якасць працоўнай сілы з трэціх краін», — адзначае **эксперт Цэнтра эканамічнай інтэграцыі Інстытута Еўропы РАН Наталля КАНДРАЦЬЕВА.**

Рынак працы Германіі не выключэнне і таксама адчувае дэфіцыт рабочых рук. Напрыклад, у 2015 годзе засталіся незапатрабаванымі 40 тыс. вакансій. Прычым гэта вакансіі рабочага профілю — якраз для большасці новых членаў нямецкага грамадства, бежанцаў з краін Афрыкі і Азіі. Прыцягненне мігрантаў прынесла заўважны вынік: паводле звестак Федэральнага статыстычнага ўпраўлення Германіі, колькасць занятых у нямецкай прамысловасці дасягнула максімуму за апошнія 12 гадоў.

Дзякуючы бежанцам чакаецца ледзь не будаўнічы бум. Калі ў 2014-м у той жа Германіі было пабудавана 70 тыс. недарагіх сацыяльных кватэр, то цяпер называецца лічба 250—300 тыс. кватэр штогод. Каб забяспечыць мігрантам прымальны лад жыцця, немцы пачнуць нарошчваць будаўніцтва жылля, лічаць эксперты. Нарэшце, перасяленцы здольныя стымуляваць спажывецкі попыт. Некаторыя эксперты, зрэшты, выказваюць сумненні, што прыток мігрантаў прыкметна адаб'ецца на спажывецкім рынку. Мігранты аддаюць перавагу набыццю самых танных тавараў, да таго ж з ценявой часткі гэтага сектара, якія толькі ўмоўна плацяць падаткі.

«Меркаванні ў дачыненні да мігрантаў разыходзяцца. Адна пазіцыя: яны спажываюць тавары і паслугі, яны ўзмоцняць унутраны попыт. Сярод іх шмат людзей з вышэйшай адукацыяй, гатовых папоўніць дэфіцыт на рынку працы. Іншая пазіцыя: яны будуць сядзець на шыі ў дзяржавы, яны не вучаць мову і малапісьменныя», — кажа адвакат з Берліна Ілья Левін. Не факт, што мігранты наогул захочуць сацыялізавацца, многія аддадуць перавагу жыццю на дапамогу. «А вось ісламізацыя насельніцтва рэальная. Сірыя ўжо прапанавала спансарства ў будаўніцтве 50 мячэцяў у нямецкіх землях», — кажа **навуковы дырэктар германа-расійскага форуму Аляксандр РАР.**






### ГАРАЧАЯ ТЭМА

Зразумела, праблема з мігрантамі стала цэнтральнай тэмай палітычнай авансцэны еўрапейскіх краін. Яна хвалявала брытанцаў, якія галасавалі за Brexit. На ёй будуюць сваю палітыку апазіцыйныя партыі. На незадаволенасць насельніцтва засіллем мігрантаў вымушаны рэагаваць афіцыйныя ўлады. На думку экспертаў, сёлета зменіцца расклад сіл са зрухам направа партый і кіраўнікоў краін ЕС. Істотны ўплыў на складаную сітуацыю ў Еўропе акажа серыя выбараў лідараў і парламентарыяў вядучых краін. У выніку гэтага Стары Свет, магчыма, будзе выглядаць зусім па-іншаму.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. «Хачу адразу растлумачыць, што Францыя больш не прыме бежанцаў. Краіна не ў стане гэтага зрабіць з-за становішча яе эканомікі, колькасці іншаземцаў, якія ўжо знаходзяцца на яе тэрыторыі, і правалу нашай сістэмы інтэграцыі», — заўважыў у інтэрв'ю Le Monde кандыдат у прэзідэнты Францыі ад «умерана правых» Франсуа Фіён. А лідар «Нацыянальнага фронту» Францыі Марын Ле Пен заявіла, што краіна павінна зрабіць свае межы непарушнымі і непераадольнымі для непажаданых мігрантаў. «Прыклад Венгрыі закліканы нагадаць нам, што адзіны спосаб кантраляваць паток мігрантаў — гэта вырашаць самім, пускаць іх ці не пускаць. І гэтае права ёсць толькі ў суверэнных дзяржаў», — упэўнена Ле Пен. Хвалі мігрантаў не спыняцца самі па сабе, лічыць яна, таму перасяленцам важна даць зразумець, што яны не патрэбны Францыі. «Мы павінны сістэматычна прытрымлівацца простага правіла: мы не прымаем у сябе замежнікаў, якім няма месца ў нашай краіне. Мы павінны адпраўляць іх на радзіму сістэматычна. І пакуль ідуць ваенныя канфлікты, размяшчаць бежанцаў, якія бягуць ад вайны, — гэта прэрагатыва міжнароднай супольнасці і ў прыватнасці ААН», — заўважыла лідар партыі.

А ўрад Італіі днямі ўхваліў увядзенне мер для «ўпарадкавання» працэсу выдачы права на прытулак і паскарэння працэсу дэпартацыі тых мігрантаў, якія гэтага права былі пазбаўлены. З пачатку 2017 года па Міжземным моры ў Еўропу прыбылі больш за 11 тысяч бежанцаў, 85% з іх прыпадае на Апеніны. Італія падпісала з Лівіяй мемарандум аб узмацненні кантролю над незаконнымі перавозкамі мігрантаў праз Сіцылійскі праліў. Прэм'ер-міністр краіны Паола Джэнцілоні, выступаючы пасля пасяджэння кабінета міністраў па міграцыйным пытанні, паведаміў, што прынятыя меры накіраваны на тое, каб бежанцы «прыбывалі бяспечным спосабам і ў кантраляваных колькасцях». Як адзначыў міністр унутраных спраў Італіі Марка Мініці, цяперашні пакет мер скароціць з трох да двух колькасць магчымых апеляцый на адмову ў прадастаўленні прытулку і павялічыць на 250 чалавек штат камісій, якія разглядаюць адпаведныя просьбы. На гэты перыяд мігрантам будзе прапанавана выконваць неаплатную сацыяльную работу па добраўпарадкаванні тэрыторый або ў дабрачыннасці. Мініці дадаў, што ў кожным італьянскім рэгіёне адкрыюцца цэнтры ўтрымання для тых, каго збіраюцца адправіць з Апенін назад. Агульная ўмяшчальнасць такіх установ складзе 1,6 тысячы чалавек.




### ЛІВІЙСКІ КАЛІДОР

Характэрная мімікрыя пад настрой немцаў канцлера Германіі Ангелы Меркель. Яна за кароткі час прайшла дыстанцыю ад перакананай у эканамічнай карысці мігрантаў для краіны і прыязнага сэлфі з імі да нядаўняга рашэння адкупіцца ад бежанцаў і стварэння «дэпартацыйных цэнтраў». Міністэрства ўнутраных спраў Германіі абвясціла аб запуску новай міграцыйнай праграмы «Пачатковая дапамога плюс». На бягучы год для фінансавання праграмы федэральны ўрад выдзеліў €40 мільёнаў. Праграма пачала працаваць з 1 лютага. Пад яе патрапілі мігранты з 45 краін. Шмат хто ў Германіі сумняваюцца, што праграма «Пачатковая дапамога плюс» прынясе які-небудзь значны вынік. Эксперт па пытаннях міграцыйнай палітыкі Катарына Эндэрс лічыць, што «многія бежанцы заплацілі немалыя грошы пасярэднікам, каб патрапіць у Еўропу. Таму ў выпадку адмовы з боку нямецкіх улад яны паспрабуюць атрымаць прытулак у іншай еўрапейскай краіне або максімальна падоўжыць сваю прысутнасць у Еўропе».

Так што, хутчэй за ўсё, Берліну давядзецца шукаць новыя спосабы, каб адправіць мігрантаў дадому. І справа тут не толькі ў набіранні балаў перад выбарамі Ангелай Меркель. Па разліках Інстытута сусветнай эканомікі ў Кілі, Германія ўжо выдаткоўвае на бежанцаў з ваюючых дзяржаў каля €25 млрд штогод. У перспектыве гэтая сума можа вырасці да €55 мільярдаў. Лічба сур'ёзная нават для нямецкага бюджэту. Вось таму Ангела Меркель і яе ўрад, якія спачатку актыўна запрашалі бежанцаў у Германію, цяпер хочуць пазбавіцца ад іх.

На думку экс-міністра замежных спраў Італіі Эмы Баніна, еўрапейскія ўрады адмаўляюцца ад палітыкі па эфектыўным кіраванні феноменам міграцыі, інтэграцыі бежанцаў у еўрапейскае грамадства і паўтараюць практычныя крокі крытыкуемага лідарамі ЕС прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. «Еўропа абураецца забаронай Трампа і намерам узвесці сцяну на мяжы з Мексікай, — кажа Баніна, — але тое, што робіцца тут, мала чым адрозніваецца ад дзеянняў амерыканскага прэзідэнта».

Саміт на Мальце, які адбыўся ў лютым, не даў адказаў на крытыку італьянскага экс-міністра. Удзельнікі саміту толькі прынялі дэкларацыю па рабоце на міжземнаморскім шляху міграцыі ў Еўрасаюз. На гэтым напрамку ўвага еўрапейцаў засяродзілася на Лівіі. Ёй абяцаная падтрымка і фінансавая дапамога, каб стрымаць паток мігрантаў у Еўропу, палепшыць умовы знаходжання бежанцаў на тэрыторыі самой Лівіі.

Сустрэча на Мальце таксама вынесла на парадак дня тэзіс аб тым, што канфігурацыя міграцыйнага патоку ў наступныя гады можа істотна змяніцца: калі раней бежанцы прыязджалі ў асноўным з Сірыі, Ірака і Афганістана, то цяпер праблема нумар адзін — Паўночная Афрыка, і ў першую чаргу Лівія, дзе грамадзянская вайна, якая доўжыцца вось ужо шэсць гадоў, крытычна абвастрыла краіну. Сітуацыя пагражае абярнуцца гуманітарнай катастрофай, што пацягне за сабой новы міграцыйны крызіс.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

28.03.2017 в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2016 год и основные направления деятельности общества в 2017 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2016 г.
4. Утверждение распределения прибыли общества за 2016 г., о выплате дивидендов за 2016 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2017 году и первом квартале 2018 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
8. Об утверждении локальных нормативных актов.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
Дата формирования реестра: 01.03.2017.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 10.03.2017 (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200050191 Наблюдательный совет

## ОТЧЕТ

### Международного социально-экономического фонда «Идея» об использовании имущества за 2016 год

Международный социально-экономический фонд «Идея» зарегистрирован Министерством юстиции Республики Беларусь решением №112 от 26.05.2011 и внесен в ЕГР за №805001668.

Адрес фонда: 220004, г. Минск, ул. Освобождения, д. 3, каб. 12.

1. Учредители фонда – Радьков В.М. и Самусев П.Н.
2. Информация о стоимости имущества фонда:
- доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, – 267 658 белорусских рублей;
- прочие доходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 19 020 белорусских рублей.
3. Информация о суммах расходов фонда:
- расходы, понесенные фондом на достижение общественно полезных целей, определенных уставом, – 23 172 белорусских рублей;
- расходы, понесенные фондом от осуществления в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, – 254 941 белорусских рублей;
- прочие расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 28 234 белорусских рублей.
4. Стоимость чистых активов фонда на 31 декабря 2016 года – 46 276 белорусских рублей.
5. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц

УНП 805001668

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

### ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

24 февраля 2017 года состоится
внеочередное общее собрание акционеров
**ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70, в 12.00 (конференц-зал)**
(собрание проводится в очной форме)

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О безвозмездной передаче 1027584 акции открытого акционерного общества "Лидагропроммаш» в республиканскую собственность Республики Беларусь.
2. Об уменьшении уставного фонда ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» путем безвозмездной передачи акции ОАО «Лидагропроммаш» в республиканскую собственность Республики Беларусь.
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».

**Наблюдательный совет**
УНП 500021638 **ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**

## Унитарное предприятие «НАФТАН-СПЕЦТРАНС»

УНП 391758348

реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| Наименование | Год выпуска | Инв. № | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Трактор МТЗ-82 | 2003 | 04152067 | 15 141 |
| Трактор МТЗ-82 | 1996 | 04150094 | 15 080 |
| Трактор МТЗ-82 | 2000 | 04150159 | 10 514 |
| Трактор МТЗ-82 | 1995 | 04150088 | 15 448 |
| Трактор МТЗ-82 | 2000 | 04150166 | 13 053 |
| Трактор МТЗ-82 | 1999 | 04150132 | 14 938 |
| Трактор МТЗ-80 | 1992 | 04152065 | 7 176 |
| Погрузчик А-4041 | 1987 | 06151200 | 6 518 |
| Погрузчик А-4041 | 1990 | 06151403 | 7 238 |
| МАЗ-5551 (самосвал) | 2006 | 13150802 | 14 632 |
| МАЗ-5551 (самосвал) | 2007 | 13150785 | 14 632 |
| МАЗ-5337 (автокран) | 1993 | 13150312 | 16 509 |
| МАЗ-5337 (автокран) | 2006 | 13150771 | 40 032 |
| МАЗ-5337А2 (бетоно-смеситель СМБ-349) | 2012 | 06280474 | 54 379 |

**Состояние удовлетворительное.**

**Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, Унитарное предприятие «Нафтан-Спецтранс», до 9.30 по местному времени 20 марта 2017 года с пометкой на конверте: «Реализация автотракторной техники. 20.03.2017».**

**Извещения на проведение конкурса размещены на сайтах: http://nstrans.by.**

**Контактные телефоны:**
8(0214) 55-76-96, 8(0214) 55-77-97, факс 8(0214) 55-77-84.

### Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

**дополнение к проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» от 11.06.2016 №110 (28220)**

В декларацию по объекту «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон №4» (1-я очередь строительства). Многоквартирный жилой дом №1 по генплану с учетом незадекларированных **последних однокомнатных квартир** внести дополнения следующего содержания:

предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

- **5 (пять) однокомнатных квартир**: №46, 50, 52, 56, 58 (площадью 42,39 – 42,41 кв. м).

Цена 1 кв. м общей площади однокомнатной квартиры в жилом доме №1 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет 2 106,50 рубля

УНП 190580553

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения, контактный телефон Покупателя акций | Открытое акционерное общество «Ремонтно-строительное управление бытового облуживания населения», Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 76, пом. 3, комн. 168, контактный телефон +375296083333 |
| Цель приобретения | Аннулирование акций и уменьшение уставного фонда |
| Полное наименование, местонахождение Эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Ремонтно-строительное управление бытового облуживания населения», Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 76, пом. 3, комн. 168 |
| Количество акций, которое намеревается приобретать Покупатель | 48 135 простых (обыкновенных) акций |
| Цена, по которой Покупатель намерен приобретать акции | 23 (двадцать три) белорусских рубля |
| Срок, форма и порядок оплаты акций | Путем безналичного перечисления денежных средств на банковский счет акционера – продавца акций не позднее 22 июля 2017 года |
| Срок перечисления акций на счет «депо» Покупателя | В течение 2 календарных дней с момента регистрации договора купли-продажи акций у профессионального участника рынка ценных бумаг |
| Адрес, по которому будут совершаться сделки купли-продажи акций | Минский район, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 76, пом. 3, комн. 168 |
| Дата начала срока представления предложений акционеров о продаже акций | 24 января 2017 года |
| Дата окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций | 10 февраля 2017 года |
| Дата начала покупки акций | 24 февраля 2017 года |
| Дата окончания покупки акций | 22 июля 2017 года |
| Расходы по регистрации договоров купли-продажи акций | Расходы по регистрации договоров купли-продажи акций принимает на себя Покупатель |

# ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР ИНВЕСТИЦИЙ И ПРИВАТИЗАЦИИ»

*17 марта 2017 г.* **проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность в Минском районе**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, определенном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Инженерная инфраструктура* | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Лесковка, участок №291 | 623680605601001239 | 0,1493 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 571,78 | 60 000,00 | 12 000,00 |
| 2 | Боровлянский с/с, д. Чертяж, участок №309 | 623680608601000424 | 0,1361 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 571,78 | 45 000,00 | 9 000,00 |
| 3 | Горанский с/с, д. Новодворщина | 623681314101000051 | 0,1488 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 732,89 | 7 900,00 | 1 580,00 |
| 4 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000320 | 0,1446 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 430,08 | 12 870,00 | 2 570,00 |
| 5 | Горанский с/с, д. Новое Поле, ул. Каштановая, участок №22 | 623681315101000353 | 0,1000 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 433,12 | 8 900,00 | 1 780,00 |
| 6 | Горанский с/с, аг. Новоселье | 623681315601000597 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 1 685,98 | 12 420,00 | 2 480,00 |
| 7 | г. Заславль, ул. Грибная, участок №15 | 623650100001005016 | 0,0707 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 619,24 | 19 396,00 | 3 870,00 |
| 8 | г. Заславль, ул. Грибная, участок №18 | 623650100001005014 | 0,0905 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 675,70 | 24 828,30 | 4 960,00 |
| 9 | Луговослободской с/с, д. Заболотье | 623684104601000217 | 0,1254 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 1 874,64 | 8 666,00 | 1 730,00 |
| 10 | Луговослободской с/с, д. Обчак, участок №33 | 623684109101000160 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 659,92 | 20 963,00 | 4 190,00 |
| 11 | Михановичский с/с, д. Михановичи, участок №5 | 623684204101000217 | 0,0924 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 996,84 | 5 807,16 | 1 160,00 |
| 12 | Михановичский с/с, д. Михановичи, участок №6 | 623684204101000218 | 0,0936 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 996,84 | 5 882,57 | 1 170,00 |
| 13 | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица, участок № 11 | 623685202101000196 | 0,1064 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 745,93 | 13 300,00 | 2 660,00 |
| 14 | Петришковский с/с, д. Анусино, ул. Солнечная | 623685700101000193 | 0,1416 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 1 607,36 | 18 671,36 | 3 730,00 |
| 15 | Самохваловичский с/с, д. Белица, массив 4, участок №5 | 623686300601000214 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 63,00 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 16 | Самохваловичский с/с, д. Русиновичи, участок №14 | 623686303101000211 | 0,1306 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 2 396,28 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 17 | Сеницкий с/с, аг. Сеница, участок №2 | 623686605101001153 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод, канализация | 1 682,43 | 66 000,00 | 13 200,00 |
| 18 | Сеницкий с/с, аг. Сеница, участок №3 | 623686605101001154 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод, канализация | 1 682,43 | 66 000,00 | 13 200,00 |
| 19 | Щомыслицкий с/с, д. Городище, участок №63 | 623688001601000422 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 63,00 | 10 920,00 | 2 180,00 |
| 20 | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок №2 | 623688006601000514 | 0,0920 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 653,88 | 32 200,00 | 6 440,00 |
| 21 | Юзуфовский с/с, д. Буды | 623688200601000026 | 0,1459 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 680,00 | 4 290,00 | 850,00 |
| 22 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи | 623688205601000327 | 0,1499 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 590,00 | 10 615,00 | 2 120,00 |
| 23 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи | 623688205601000328 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 1 585,00 | 10 620,00 | 2 120,00 |

**Аукцион состоится *17 марта 2017 года* в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**
Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 13 марта 2017 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и 13.30 до 17.00.
Контактные телефоны: + 375 (17) 205-46-61, +375 (44) 789-10-18.
**Задатки для участия в аукционе перечисляются не позднее 13 марта 2017 года на следующие расчетные счета:**
**на лоты 1–2** перечисляется **на расчетный счет №3641900000163 Боровлянского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901;
**на лоты 3–6** перечисляется **на расчетный счет №3641900000150 Горанского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901;
**на лоты 7–8** перечисляется **на расчетный счет №3641621200079 Заславского горисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901;
**на лоты 9–10** перечисляется **на расчетный счет №3641900000075 Луговослободского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901;
**на лоты 11–12** перечисляется **на расчетный счет №3641900000105 Михановичского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901;
**на лот 13** перечисляется **на расчетный счет №3641000000047 Острошицко-Городокского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901;
**на лот 14** перечисляется **на расчетный счет №3641900000277 Петришковского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901;
**на лоты 15–16** перечисляется **на расчетный счет №3641900000088 Самохваловичского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901;
**на лоты 17–18** перечисляется **на расчетный счет №3641900000134 Сеницкого сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901;
**на лоты 19–20** перечисляется **на расчетный счет №3641000000076 Щомыслицкого сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901;
**на лоты 21–23** перечисляется **на расчетный счет №3641900000147 Юзуфовского сельисполкома**, филиал №614 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.
Для участия в аукционе необходимо:
**внести задаток (задатки) не позднее 13 марта 2017 г.** в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);
**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» следующие документы:**
заявление на участие в аукционе установленной формы;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков, с отметкой банка;
подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за земельный участок в размере начальной цены земельного участка, увеличенной на 5%, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
**дополнительно представляется:**
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников.
Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка **обязан:**
- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить местному исполнительному комитету расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней местный исполнительный комитет выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.
Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
* в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями

Марыя ШКАНАВА:

# «СПУСКАЦЦА СА СХІЛУ — ЗАДАВАЛЬНЕННЕ»

**На XXVIII Сусветнай зімовай Універсіядзе ў Алматы наша зборная заваявала 6 медалёў і замкнула дзясятку наймацнейшых краін у агульным заліку топ-турніру. Роўна палова ўзнагарод на рахунку беларускай гарналыжніцы Марыі Шканавай. Дзяўчына сабрала поўны камплект медалёў, выйграўшы «золата» ў слаламе, «серабро» ў суперкамбінацыі і «бронзу» ў гіганцкім слаламе. У самым разгары сезона, напярэдадні важных стартаў чэмпіянату свету, спартсменка знайшла час пагутарыць з карэспандэнтам «Звязды».**



— Адразу пасля завяршэння спаборніцтваў у Казахстане мы паляцелі ў Швейцарыю на планетарнае першынство, старты прызначаныя на 16 і 18 лютага, — *раcказвае Марыя.*

***— Настрой пасля паспяховай Універсіяды добры?***

— Вядома, такі эмацыйны ўздым, можа быць, дапаможа выступіць добра і на чэмпіянаце свету. У прынцыпе, я ведала, што здольная выйграць медаль у Алматы, вельмі хацелася менавіта залаты, і вось у апошні дзень спаборніцтваў мне гэта ўдалося. Хоць на Універсіядзе сабралася шмат моцных спартсменак у нашым відзе — гэта і расіянкі, і немкі, і аўстрыйкі, наогул, было з кім спаборнічаць. Траса была падрыхтаваная вельмі добра, таму ўсе ўдзельніцы былі ў роўных умовах, што спрыяла добрай барацьбе.



Наогул, вельмі спадабалася арганізацыя спаборніцтваў, было відаць, што праведзена сур'ёзная падрыхтоўка. Зрабілі выдатную алімпійскую вёску, цудоўна працавалі валанцёры. На жаль, не ўдалося паглядзець сам горад, таму што ў наш адзіны выхадны было дрэннае надвор'е.

***— Калі-небудзь ужо ўдавалася атрымліваць медалі ўсіх проб на адным турніры?***

— Не, такога яшчэ не было. Пасля добрых выступленняў атрымала вельмі шмат віншаванняў, у першую чаргу ад трэнераў, нашай дэлегацыі, потым ужо ад сябровак, бацькоў і федэрацыі. На самай справе нават не чакала такой увагі.

***— Як увогуле для вас складаецца сёлетні перадалімпійскі сезон?***

— Заўсёды хочацца лепшага, заўсёды ўсяго мала, але ў прынцыпе ён складаецца досыць нядрэнна. На Кубку свету я ўпершыню ў кар'еры трапіла ў першую трыццатку, палепшыла свае пазіцыі, заваявала тры ўзнагароды на Універсіядзе — гэта добры вынік. Цяпер яшчэ засталося добра выступіць на чэмпіянаце свету — і можна быць задаволенай сабой.

***— За плячыма ўжо дзве Алімпіяды, пачалі падрыхтоўку да трэцяй?***

— Выступленне ў Ванкуверы і Сочы разглядаю ў першую чаргу як каласальны і вельмі каштоўны вопыт. Алімпійскія гульні — гэта спаборніцтвы, якія немагчыма параўнаць з якімі-небудзь іншымі. Кожны спартсмен марыць выступіць на іх і выйграць там медаль, я не выключэнне. Таму, вядома, ужо пачалі падрыхтоўку да Пхенчхана. У гарналыжным спорце ёсць рэйтынг, па якім спартсмены адбіраюцца на Гульні, па ім я праходжу на Алімпіяду-2018, і, думаю, нешта ці нешта можа змяніцца.

***— Родам вы з Расіі?***

— Так, нарадзілася я ў Санкт-Пецярбургу, а потым жыла ў Магнітагорску. Дзесьці ў 8 гадоў мама паставіла мяне на лыжы, а ў 18 прапанавалі пераехаць у Беларусь. Пагадзілася практычна адразу, таму што гэта быў самы лепшы варыянт для працягу маёй кар'еры. Так, ужо 8 гадоў выступаю за Беларусь.

***— Мама не была супраць?***

— Не, яна дала магчымасць мне самой выбіраць гэты шлях. Спачатку, вядома, вельмі сумавала, а цяпер ужо прывыкла. Я вельмі рэдка лётаю ў Магнітагорск, усяго раз на год, але мама сама прылятае ў Мінск.

***— Натуралізацыя — заўсёды спрэчнае пытанне, могуць узнікаць крыўды і непаразуменні ў абедзвюх краін.***

— Мяне гэта неяк абышло. Я і цяпер выдатна кантактую з гарналыжнікамі з Расіі, ды і тут на мяне не глядзелі коса, быццам я заняла нечае месца. Можа быць, таму што ў Беларусі на той момант было вельмі мала людзей у гэтым відзе спорту. Я лёгка і вельмі хутка ўлілася ў маленькі гарналыжны калектыў.

***— Цяпер ужо адчуваеце сябе беларускай?***

— Вядома! Заўсёды з упэўненасцю адказваю на гэтае пытанне. Калі пытаюцца, з якой я краіны, не задумваючыся адказваю, што з Беларусі. Сёння ўсё маё жыццё ў асноўным праходзіць у Мінску, я вельмі люблю гэты горад. Нягледзячы на тое, што гэта сталіца, але ён не такі, як Масква, дзе ўсё бяжыць, вар'яцкія заторы, людзі заўсёды кудысьці спяшаюцца. Мінск — прыемны, спакойны горад. Яшчэ я паспела палюбіць дранікі (смяецца).

***— Трэніруецеся вы не ў Беларусі?***

— Наш настаўнік са Славеніі, таму мы шмат часу праводзім там, а трэніруемся ў асноўным у Аўстрыі. Праводзім у гэтай краіне шмат часу, ужо прывыклі да яе. Праўда, мала што бачым, каб даведацца падрабязней пра краіну, і маем зносіны ў асноўным толькі са спартсменамі.

***— У нашай краіне гарналыжны спорт не папулярны, даводзіцца сутыкацца з праблемамі ў ходзе работы?***

— Узнікаюць нейкія пытанні з фінансаваннем, але грошай ніколі не бывае шмат. У прынцыпе, апошнімі гадамі нам забяспечваюць падрыхтоўку на нармальным узроўні, таму не скардзімся.

Вядома, наўрад ці ў Беларусі горныя лыжы ў хуткім часе стануць папулярнымі, тут няма асаблівай базы, «Сілічы», «Сонечная даліна» — гэтага недастаткова. Калі казаць пра іншыя еўрапейскія дзяржавы, то найбольш папулярныя горныя лыжы ў альпійскіх краінах, такіх, як Швейцарыя, Францыя. Тут дзяцей на лыжы ставяць ужо ў 2-3 гады.

***— Вы займаецеся досыць траўманебяспечным відам спорту, не страшна?***

— Страх быў, напэўна, толькі ў дзяцінстве, а калі ты ўсё жыццё гэтым займаешся, то атрымліваеш ад спуску са схілу толькі задавальненне. Вядома, здараюцца сур'ёзныя траўмы, і мяне яны таксама не абышлі бокам. Былі праблемы са спінай — міжпазваночная грыжа. Два гады таму рабілі аперацыю, але, спадзяюся, што цяпер усё будзе нармальна.

***— Чым займаецеся ў рэдкія свабодныя ад трэніровак гадзіны?***

— Люблю і іншыя зімовыя віды спорту, назіраю за біятлонам, цяпер хварэем за нашу, беларускую, каманду на чэмпіянаце свету. Сачу за скачкамі з трампліна і лыжнымі гонкамі. У вольны час стараюся вучыць нямецкую мову, англійскую і славенскую ўжо ведаю, хацелася б валодаць яшчэ адной ■

# НОВАЯ ВЫШЫНЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Адзначым, што трохразовая алімпійская чэмпіёнка вярнулася ў эліту сусветнага біятлона пасля нараджэння дачкі Ксеніі, якая з'явілася на свет усяго чатыры месяцы таму.

*— Перад стартам не думала пра медаль. Мне хацелася толькі выправіць памылкі, дапушчаныя ў спрынце (там Домрачава была толькі 27-й). Пасля той гонкі хацелася пайсці ў лес і гучна пакрычаць, каб вызваліць эмоцыі,* — расказала Дар'я пасля фінішу ў пасьюце. *— Вельмі шчаслівая, што адстралялася без памылак. У біятлоне складана і ўдала страляць, і хутка бегчы. Часам я лепш бягу, часам страляю. Мой сярэбраны медаль — спалучэнне абодвух гэтых кампанентаў. Часта чула ад журналістаў: давай вяртайся! Сёння я гэта зрабіла,* — адзначыла Домрачава.

Таксама Дар'я падкрэсліла, што шмат у чым ёй дапамог славуты муж, біятланіст Уле Эйнар Б'ёрндален.

*— Ён аказвае мне выдатную падтрымку. Муж паказаў мне іншы падыход да трэніровак. Кожны можа пазайздросціць яго арганізаванасці і здольнасці паспяваць рабіць шмат рэчаў і з усім спраўляцца. Ён выдатны спартсмен з велізарным вопытам. Я магу сказаць, што некаторыя карысныя парады мне вельмі дапамаглі ў патрэбны момант,* — расказала біятланістка і дадала, што маленькая дачка зусім не перашкода для яе падрыхтоўкі. *— Яна знаходзіцца тут са мной, пра Ксенію клапоціцца нянька. Акрамя таго, хутка сюды прыедзе мая мама. Дачка ў мяне добрая дзяўчынка і дае мне высыпацца, я толькі некалькі разоў прачыналася, каб яна магла перакусіць, але гэта нармальна.*

Адзначым, што ў сям'і Домрачавай і Б'ёрндалена ў нядзелю з'явілася адразу дзве ўзнагароды. Нарвежац таксама падняўся на п'едэстал у мужчынскай гонцы пераследу, заваяваўшы бронзавую ўзнагароду.

*— Сённяшні дзень прынёс палёгку ўсёй сям'і. Было выдатна назіраць фініш Дар'і, трымаючы Ксенію на каленях. Дар'я — незалежная і неймаверна моцная асоба. Нам абодвум падабаецца спасцігаць нешта новае, але мы прыслухоўваемся адно да аднаго,* — адзначыў Б'ёрндален.

Нагадаем, сярэбраны медаль Домрачавай з'яўляецца пакуль адзінай узнагародай у скарбонцы беларускай зборнай. Спаборніцкая праграма чэмпіянату свету працягнецца заўтра, 15 лютага, індывідуальнай гонкай у жанчын ■

■ Экспрэс-навіны

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПЕРАМОГА НА МІНСКІМ КОРЦЕ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра матч Кубка Федэрацыі, які прайшоў у сталіцы, чарговую перамогу Антона Кушніра і вынікі этапу Кубка свету па шорт-трэку, які прыняла наша краіна.**

***1. Тэнісісткі зборнай Беларусі на дамашніх кортах абыгралі каманду Нідэрландаў у чвэрцьфінале Сусветнай групы Кубка Федэрацыі з агульным лікам 4:1.*** Гэтую перамогу ўжо можна назваць гістарычнай, таму што беларускі ўпершыню выступаюць у элітнай групе гэтага турніру і адразу ж прабіліся ў паўфінал.



Прэзідэнт краіны, які асабіста прысутнічаў на кортах «Чыжоўка-Арэны» сярод балельшчыкаў, павіншаваў каманду з поспехам. «Дзякуй! Малайцы! Вельмі добра гулялі!» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Нагадаем, у першы дзень спаборніцтваў Аляксандра Сасновіч перамагла Міхаэлу Крайчык — 4:6, 6:3, 6:2, а Арына Сабаленка саступіла Кікі Бертэнс — 6:3, 6:7, 4:6. У парнай сустрэчы Вольга Гаварцова і Вера Лапко перайгралі галандскі дуэт Аранта Рус/Сіндзі Бургер у двух сэтах — 6:4, 6:2. У гэты ж дзень нашы дзяўчаты атрымалі яшчэ дзве перамогі ў адзіночных паядынках: Аляксандра Сасновіч узяла верх над Кікі Бертэнс — 6:3, 6:4, а Арына Сабаленка перайграла Міхаэлу Крайчык — 7:6, 6:4.

*— Я вельмі задаволены! Усе ўдзельніцы паядынку малайцы! Мы зрабілі пэўныя высновы пасля першых гульняў. У нядзелю дзяўчат я ўбачыў зусім іншымі. Саша Сасновіч вельмі агрэсіўна і дакладна згуляла, і Арына Сабаленка была эмацыйна зараджана. Яны могуць гуляць значна вышэй і лепш, быць у топ-50 — гэта як мінімум,* — адзначыў **капітан каманды Эдуард Дуброў.**

Цяпер у матчы за выхад у фінал неафіцыйнага чэмпіянату свету сярод жаночых каманд зборная Беларусі 22—23 красавіка сустрэнецца са зборнай Швейцарыі, матч адбудзецца ў Мінску.

***2. Алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір стаў пераможцам 5-га этапу Кубка свету па лыжнай акрабатыцы ў паўднёвакарэйскім Букволе.*** Гэта ўжо трэція перамога беларуса на этапах Кубка свету па фрыстайле сёлета. Раней Антон станавіўся пераможцам этапаў Кубка свету 17 снежня ў Бейда-Лэйк (Кітай) і 14 студзеня ў Лейк-Плэсідзе (ЗША).

Станіслаў Гладчанка на 5-м этапе Кубка свету заняў 19-е месца, Максім Гусцік стаў 25-м. У жаночых спаборніцтвах беларуска Аляксандра Раманоўская заняла 4-е месца.

У агульным заліку Кубка свету сярод лыжных акрабатаў у мужчын пасля 5 этапаў лідзіруе кітаец Ці Гуанпю, Антон Кушнір займае 2-е месца. У заліку Кубка свету сярод жанчын лідзіруе кітаянка Сю Ментаа, Аляксандра Раманоўская размяшчаецца на 10-й пазіцыі, Ганна Гуськова — на 15-й.

Наступны этап 25 лютага прымуць беларускія Раўбічы, а завершыцца праграма Кубка свету 4 сакавіка ў Маскве.

***3. «Мінск-Арэна» прыняла заключны ў гэтым сезоне этап Кубка свету па шорт-трэку.*** У Мінск прыехалі прадстаўнікі 23 краін, сярод удзельнікаў на мінскім лёдзе выступілі алімпійскія чэмпіёны і чэмпіёны свету. Беларусь была прадстаўлена 9 спартсменамі, праўда, ніхто з іх не змог падняцца на п'едэстал.

Па выніках мінскага этапу ў жаночых спаборніцтвах у камандным заліку найбольш паспяхова выступілі спартсменкі з Кітая, Паўднёвай Карэі і Італіі; беларускі — 11-я. У мужчын больш за ўсё ачкоў набралі Паўднёвая Карэя, Казахстан і Галандыя; Беларусь — на 12-й пазіцыі ■

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **5.** Размер заработнай платы, устаноўлены ў адпаведнасці з пасадай работніка. **6.** Паласа, ашалёўка па краі. **11.** Буйны паўзун з тоўстай панцырнай скурай, які водзіцца ў вадаёмах трапічных краін. **12.** Выбірай ... па лоўлі, а кручок па рыбе (прык.). **14.** «Навука — гэта ..., і вучоны чалавек ніколі не прападзе». Петроній. **15.** Буйная млекакормячая жывёліна атрада парнакапытных, якая жыве ў прэснаводных вадаёмах трапічнай Афрыкі. **16.** Часовае ці пастаяннае аб'яднанне ўзброеных сіл. **19.** Знак для абазначэння ліку. **20.** Тоўстая завостраная палка. **21.** Узаемная дамоўленасць. **24.** Шарападобная або канічная шкляная пасудзіна з доўгім горлам для хімічных работ. **25.** Шырокая канапа без спінкі. **27.** Шырокі выступ печы для ляжання. **28.** Мяккі белы вапняк, які ўжываецца для пабелкі, чысткі, пісання і інш.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Паездка, наведванне чаго-небудзь з якойсьці мэтай. **2.** Паўднёваамерыканскі трохпальцы страус. **3.** Перапынак у гучанні музычнага твора або якой-небудзь яго часткі. **4.** Розніца межаў, паміж якімі змяняецца якая-небудзь пераменная велічыня. **7.** Ядомы плод некаторых дрэў і кустоў. **8.** Шматгадовая травяністая расліна сямейства злакаў з цвёрдым шчацінападобным сцяблом, якая сустракаецца на дрэннай пашы, лузе. **9.** Невялікае ўзвышша, узгорачак на паверхні зямлі. **10.** Скамянелая, звычайна жоўтага колеру розных адценняў, смала хвойных дрэў, якая ўжываецца для вырабу розных аздоб. **13.** Будаўнічы матэрыял, атрыманы з зацвярдзелай сумесі пяску, шчэбеню, гравію з цэментам і вадою. **17.** Месца, дзе што-небудзь абламалася. **18.** Як звалі жанчыну, якая выпусціла на свет адразу дзесяць негрыцянят? **22.** Прастора, якую можна акінуць, ахапіць вокам. **23.** Птушка сямейства крумкачовых з чорным апярэннем. **26.** Снежная бура; мяцеліца, завіруха.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 5. Аклад. 6. Кайма. 11. Кракадзіл. 12. Вудзільна. 14. Скарб. 15. Бегемот. 16. Атрад. 19. Лічба. 20. Кол. 21. Згода. 24. Колба. 25. Тахта. 27. Ляжанка. 28. Мел.
**Па вертыкалі:** 1. Экскурсія. 2. Нанду. 3. Паўза. 4. Амплітуда. 7. Фрукт. 8. Сівец. 9. Бугор. 10. Янтар. 13. Бетон. 17. Аблом. 18. Агата. 22. Абсяг. 23. Галка. 26. Завея.

Даты | Падзеі | Людзі

**14 ЛЮТАГА**

**286** год — згодна з Залатой легендай, у гэты дзень пакараны за парушэнне загаду імператара Клаўдзія аб целібаце для воінаў палявы лекар і святар Валянцін. Ён таемна вянчаў ахвотных і за гэта быў асуджаны на смерць. У розных легендах прыводзіцца падрабязнасці аб развітальным лісце, які Валянцін напісаў перад пакараннем смерцю сляпой дзяўчыне (па іншых варыянтах — дачцэ турэмшчыка) і які вылечыў яе. У многіх краінах свету адзначаецца Дзень закаханых.

**1907** год — нарадзіўся (г. Мінск) Алесь (Пётр Барысавіч) Звонак, беларускі паэт. У 1936 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1954 годзе. Аўтар кнігі ўспамінаў пра беларускіх пісьменнікаў «Неспакойныя сэрцы», п'есы «Навальніца будзе» (па трылогіі Я. Коласа «На ростанях»), шэрагу сцэнарыяў навукова-папулярных фільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1996 годзе.

**1918** — Савецкая Расія перайшла на грыгарыянскі каляндар (1 лютага па юліянскім календары).

**1937** год — нарадзіўся (в. Сычын Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобласці) Міхась (Міхаіл Лявонавіч) Стральцоў, беларускі пісьменнік, перакладчык, крытык. Аўтар зборнікаў публіцыстыкі «Жыццё ў слове», «Сена на асфальце», эсэ «Загадка Багдановіча», зборнікаў вершаў «Ядлоўцавы куст», «Цень ад вясла» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1987 годзе.



**1956** — у Маскве адкрыўся XX з'езд КПСС. Найбольш вядомы асуджэннем культу асобы і, ускосна, ідэалагічнай спадчыны Сталіна.

**1972** год — у Савецкім Саюзе ажыццёўлены запуск аўтаматычнай міжпланетнай станцыі «Месяц-20».



**1992** год — кіраўнікі краін — удзельніц СНД падпісалі ў Мінску дамову аб вяртанні (рэстытуцыі) культурных і гістарычных каштоўнасцяў дзяржавам, з якіх яны былі вывезены. На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД прынята Дэкларацыя аб прынцыпах супрацоўніцтва.

Было сказана

**Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК, паэт:**
*«Няма ні грэшных і ні праведных,*
*А ёсць каханыя і не...»*

## Будзь у курсе!

## Набыць білет у раз'язнога касіра

**Магістраль прапануе зрабіць гэта па картцы**

**Беларуская чыгунка сумесна з ААТ «ААБ Беларусбанк» рэалізуе пілотны праект па ўкараненні аплаты паслуг па банкаўскіх плацежных картках у цягніках.**

Так, у паяздах рэгіянальных ліній эканомкласа, якія курсіруюць па маршруце Асіповічы — Пухавічы, пасажыры цяпер могуць набыць білет у раз'язнога касіра, аплаціўшы яго банкаўскай карткай, а ў поездзе №658/657 Брэст — Віцебск такім жа чынам разлічыцца за чайную прадукцыю і пасцельную бялізну, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Калі праект зарэкамендуе сябе са станоўчага боку і гэтая паслуга будзе карыстацца попытам, плануецца разгледзець пытанне аб далейшым укараненні плацежных тэрміналаў у паяздах.

Дарэчы, у 2016 годзе з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак на сайце Беларускай чыгункі было афармлена больш за 1,6 мільёна білетаў, а праз тэрміналы самаабслугоўвання — 745,7 тысячы білетаў.

## Ніякай пагрозы

## Узмоцнены маніторынг радыяцыйнай абстаноўкі

**Сітуацыя стабільная, такі крок — дзеля кантролю**

**Сістэма радыяцыйнага маніторынгу Гідрамета пераведзена ва ўзмоцнены рэжым для своечасовай ацэнкі змяненняў радыяцыйнай абстаноўкі ў навакольным асяроддзі з 9 лютага, паведаміла прэс-служба Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Яна спасылаецца на паведамленні СМІ пра тое, што, «на атамнай электрастанцыі «Фламанвіль» на паўночным захадзе Францыі адбыўся выбух». Ён прагрымеў у машынным аддзяленні электрастанцыі. Па звестках афіцыйных улад, пагрозы ўцечкі радыеактыўных рэчываў няма. Тым не менш у рамках узаемадзеяння дзяржаўных гідраметэаралагічных службаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі зроблены разлікі магчымага распаўсюджвання ў выпадку пападання прадуктаў выбуху ў навакольнае асяроддзе (на перыяд з 9 па 12 лютага).

Прагноз траекторый распаўсюджвання паветраных мас на розных вышынях (500, 1500 і 3000 метраў), пабудаваны з улікам рэальных і прагназуемых сінаптычных умоў, сведчыць, што прадукты выбуху (у выпадку іх выкіду ў атмасферу) будуць распаўсюджвацца ў напрамку Атлантычнага акіяна. Такая сітуацыя не будзе ўяўляць пагрозы для тэрыторыі Беларусі.

У цяперашні час радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі краіны застаецца стабільнай, перавышэнняў над сярэднешматгадовымі ўзроўнямі не адзначана.

У мэтах кантролю над сітуацыяй з 9 лютага сістэма радыяцыйнага маніторынгу дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы Мінпрыроды пераведзена ва ўзмоцнены рэжым для своечасовай ацэнкі змяненняў радыяцыйнай абстаноўкі ў навакольным асяроддзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.31 | 18.17 | 9.46 |
| Віцебск — | 8.24 | 18.03 | 9.39 |
| Магілёў — | 8.21 | 18.07 | 9.46 |
| Гомель — | 8.14 | 18.07 | 9.53 |
| Гродна — | 8.46 | 18.33 | 9.47 |
| Брэст — | 8.42 | 18.37 | 9.55 |

## Месяц

*Поўня 11 лютага.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.** Мікалая, Пятра, Трыфана.*
***К.** Ліліяны, Валянціна, Кірылы, Мяфодзія.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Цётка, я ж ваш пляменнік, няўжо вы мяне не пусціце пераначаваць?

— Я і рада бы, але нам самім удваіх у васьмі пакоях цесна.

**Пасля таго як я кінуў піць, мне наогул перастала падабацца рыбалка.**

На прыёме ў доктара:

— Доктар, у мяне баліць усё!

— Ну гэта вы загнулі, даражэнькі: на ўсё ў вас грошай не хопіць.

**Спадабаўся адпачынак з унукам: я пазнаёміўся з маладухай гадоў сарака, а ён — з бабулькай гадоў трыццаці, і мы класна адцягнуліся.**

— Дзяўчаты павінны памятаць, што калі яны доўга «дынамяць» хлопца, то ў яго можа развіцца сіндром школьніка.

— Што за сіндром?

— Гэта калі ты доўга-доўга ў бацькоў прасіў веласіпед, а калі яго ўсё ж купілі, табе ўжо ролікі захацелася.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 681.
Нумар падпісаны ў 19.30 13 лютага 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12